

ПРЫПЫНАК ІМЯ АДАМОВІЧА З'ЯВІЦЦА Ў ГЛУШЫ 4

ЯК АДПАЧЫВАЮЦЬ НАШЫ ДЗЕЦІ МС



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родным мове

# ЗВЯЗДА

10 ЖНІЎНЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 152 (28768)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

### ЛІЧБА ДНЯ

**7,7 тысячы**

*беларускіх школьнікаў у I паўгоддзі змаглі падпрацаваць у вольны ад вучобы час. Працоўны дагавор можна заключаць з 14 гадоў. За тры тыдні хлопчыкі і дзяўчаткі могуць зарабіць Br230—270. Усяго сёлета плануецца знайсці часовую падпрацоўку прыкладна для 30 тысяч непаўналетніх. У асноўным такой магчымасцю дзеці карыстаюцца падчас летніх канікул. Моладзі прапануецца пераважна некваліфікаваная праца: прыборка тэрыторый, азеляненне, рэстаўрацыя бібліятэчнага фонду, выраб сувеніраў, пашыў швейных вырабаў, вырошчванне сельгаспрадукцыі. Фінансаванне часовай занятасці моладзі ажыццяўляецца за кошт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.*

### КОРАТКА

- УП «Белтэхагляд» падтрымлівае прапанову аб змене механізму выплаты дарожнага збору.



- **У Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня» на аздараўленне прыедуць 150 дзяцей з Кітайскай Народнай Рэспублікі.**
- У Мінску 8 жніўня 2018 года ўзялі шлюб 108 пар.
- **У Грэцыі зафіксаваны два смяротныя выпадкі заражэння вірусам ліхаманкі Заходняга Ніла.**
- У Віцебску пачасціліся крадзяжы грошай з банкаўскіх картак у карыстальнікаў сацсетак.
- **Марыя Складоўская-Кюры ўзначаліла спіс 100 жанчын, якія змянілі свет.**

ISSN 1990 - 763X

■ Вытокі малой радзімы

# КВЕТКІ НАД КРЫНІЦАЙ



**Духоўная сувязь, гармонія прыроды і чалавека! У Лунінецкім раёне, паблізу старажытнай вёскі Кажан-Гарадок, дзесяць гадоў таму прабілася крыніца. Многія палешукі пабачылі ў гэтым з'яўленні сімвал адраджэння духоўнасці краю. Выток упарадкавалі — паставілі над ім калодзеж, асвяцілі, побач збудавалі альтанку. Не было таго дня, каб да крыніцы ніхто не прыходзіў, асабліва ў летнія дзянькі. Ваду палюбілі і жыхары суседніх вёсак — Дрэбска, Лахвы. Нядаўна пад апекай Сельскага Савета правялі яшчэ адно ўпарадкаванне некранутага кутка прыроды.**

**Каля крыніцы — карэнная кажан-гарадоцкая жыхарка, майстар інкрустацыі саломай Валянціна БУРА, захавальніца народнай культуры Палесся. Валянціне Фёдараўне застаўся сапраўдны скарб — жаночы святочны строй, які ў дваццатых гадах мінулага стагоддзя выткала, пашыла і ўпрыгожыла кветкавымі арнаментамі яе бабуля Варвара Вайцяхоўская. Ад бабулі да сваёй дачкі, а пазней і да ўнучкі — не рвецца нітка памяці і гонару: Валянціна марыць, каб кожная яе зямлячка ў сваім гардэробе мела і час ад часу насіла свой — кажан-гарадоцкі строй.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ Харчовая бяспека

# СЕЛЕКЦЫЯ ПАСКАРАЕЦЦА

## Ці трэба адмаўляцца ад азімага жыта?

**Новыя тэхналогіі ўсё больш уплываюць на сельскую гаспадарку. Вучоныя працуюць не толькі над абнаўленнем сартавога складу і вывядзеннем прадукцыйных жывёл, мяняецца сам уклад галіны — распрацоўваецца сучасная тэхніка, якая аблегчыць працу на сяле, рабатызаваныя фермы і нават новае камп'ютарнае забеспячэнне для гаспадарак.**

### Як перамагчы засуху?

Штогод мяняюцца найменні культур, якія вырошчваюцца на нашых палях. На змену старым сартам прыходзяць новыя — больш ураджайныя і адаптаваныя пад нашы кліматычныя ўмовы. За дзесяцігоддзе ў дзяржрэестр уключана больш як сто сучасных сартоў, толькі за апошнія тры — каля дваццаці. Наогул 80 працэнтаў збожжавых і зернебабовых культур, што вырошчваюцца на нашых палях, — беларускай селекцыі, а яшчэ нашы сарты ўключаны ў рэестры 80 краін свету.

Калі ў 90-х гадах азімы рапс, які вырошчваўся ў Беларусі, вымярзаў, то ў наш час выведзены зімаўстойлівыя сарты, якія запатрабаваныя ўжо і за межамі краіны. Наогул на сёння рапс — асноўная бялкова-алейная культура, яго пасевы займаюць каля 500 тысяч га. І хоць з-за неспрыяльнага надвор'я, як адзначаюць вучоныя, сёлета гаспадаркі не дабяруць ураджаю, дзяржзаказ будзе выкананы. Добра развіваецца кукуруза, яна дазволіць вырашыць пытанні з фуражом. Справа ў тым, што 70 працэнтаў збожжа, што вырошчваецца ў краіне, ідзе на фуражныя мэты.

Не сакрэт, што сёлета з-за чэрвеньскай засухі мы не атрымаем той ураджайнасці збожжавых, як планавалася. Між іншым, ад гэтага пацярпелі і гаспадаркі суседніх Польшчы і Расіі. Але ў вучоных ёсць пэўныя прапановы, што рабіць, каб наступствы ад такіх прыродных катаклізмаў былі менш небяспечныя для сельскай гаспадаркі. Распрацавана навукова абгрунтаваная структура пасяўных плошчаў.

СТАР. 3

■ Фінансы

# ПАРТНЁРСТВА З ІНСПЕКЦЫЯЙ

## Да канца года плануецца прыняць новую рэдакцыю Падатковага кодэкса

**Дакумент сумесна рыхтавалі Міністэрства фінансаў разам з Міністэрствам па падатках і зборах. Асноўны ўпор у ім зроблены на спрашчэнне падатковага адміністравання, забеспячэння прастаты і зразумеласці нормаў, мінімізацыю прававой няўпэўненасці, няўзгодненасці прадпісанняў, заявіў на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры намеснік міністра фінансаў Дзмітрый КІЙКО.**

Спікер запэўніў, што распрацоўшчыкі законапраекта абмеркавалі ўсе пытанні, якія ў апошнія гады ўздымала бізнес-супольнасць, і па большасці з іх прынятае ўзгодненае рашэнне.

Адзін з асноўных прынцыпаў, які прадугледжаны ў новай рэдакцыі кодэкса, і быў закладзены ў Дэкрэт № 7, — прынцып добрасумленнасці плацельшчыка. «Разам з астатнімі прынцыпамі — роўнасці, стабільнасці заканадаўства, справядлівасці падаткаабкладання — закладзены прынцып добрасумленнасці плацельшчыка, і ён будзе азначаць наступнае: пакуль кантралёры не дакажуць, што здзейснена падатковае праваапарушэнне, і пакуль гэта не будзе дакументальна зафіксавана, да гэтага часу плацельшчык будзе прызнавацца добрасумленным», — растлумачыла намеснік міністра па падатках і зборах Эла Сяліцкая.

Наступнае новаўвядзенне: прынцып экстэрытарыяльнага абслугоўвання плацельшчыкаў — фізічных асоб. Зараз плацельшчык у любой сітуацыі, звязанай з падаткамі, вымушаны звяртацца ў падатковы орган па месцы сваёй рэгістрацыі. У якасці эксперымента ў законапраект закладзена права фізічнай асобы звяртацца ў любы падатковы орган краіны. Напрыклад, дэкларацыю можна будзе падаць па месцы камандзіроўкі. «Мы цяпер актыўна развіваем магчымасць электроннай падачы дэкларацыі, але разумеем, што не ўсе людзі яшчэ да гэтага гатовыя, — заўважыла Эла Сяліцкая. — Таму імкнёмся стварыць больш камфортныя ўмовы».

Змяненні закранулі памеры налічанай пені за нясвоечасова выплачаны падатак па выніках праверкі. Леташні Указ № 376 абмежаваў налічэнне пені тэрмінам не больш за пяць гадоў. Цяпер прапануецца налічваць пеню па выніках праверкі не больш за суму дадатковa налічанага падатку. Зараз пеня, налічаная па выніках праверкі за памылку шматгадовай даўніны, можа шматкроць перавысіць суму самой памылкі і прывесці плацельшчыка да банкрутства.

Спыненне вытворчай дзейнасці плацельшчыка выклікае і такі спосаб забеспячэння падатковых абавязацельстваў пры бягучай запазычанасці, як прыпыненне аперацый па рахунках. «Для стварэння нармальных умоў дзейнасці плацельшчыка мы прадугледзелі новы механізм: калі плацельшчык здзейсніў парушэнне, але да гэтага на працягу паўгода добраахвотна выконваў свае падатковыя абавязацельствы ў поўным аб'ёме, то такому плацельшчыку будзе дадзена яшчэ 10 дзён для выплаты падатку. Калі выплаціць, аперацыі па рахунках спыняцца не будуць, — прывяла прыклад новага падыходу намеснік міністра па падатках і зборах. — Калі плацельшчык напярэдадні парушэння плаціў падаткі са спазненнем, але да першага часта месяца, які ідзе за справаздачным (тэрмін для выплаты падаткаў — не пазней за 22 чысло), яму будзе дадзена пяць дадатковых дзён для добраахвотнага выканання сваіх абавязкаў. Выконвае — аперацыі па рахунках спыняцца не будуць. Калі плацельшчык нядобрасумленны, сістэматычна спазняецца з выплатай падаткаў, тады будзе выкарыстоўвацца дзеючы механізм. Такая градацыя дазволіць стварыць дадатковыя ўмовы для выплаты падаткаў і нармальнай работы плацельшчыкаў».

Па выніках праверкі дзеючы механізм спагнання недаплачаных падаткаў наступны: пасля ўручэння акта праверкі дадаткова налічваецца сума падатку, а на наступны дзень аперацыі па рахунках спыняюцца. У новай рэдакцыі прапануецца ўвесці яшчэ тры спосабы выплаты недаплачаных падаткаў: калі плацельшчык дае пад залог маёмасць (сваю або трэцяй асобы) або банкаўскую гарантыю, або паручыцельства, тады на працягу трох месяцаў аперацыі па рахунках не прыпыняюцца. Пасля гэтага тэрміну запазычанасць будзе спаганяцца не толькі з плацельшчыка, але і з паручыцеля або банка. Тры месяцы дазваляюць плацельшчыку абскардзіць рашэнне падатковай інспекцыі.

У законапраекце замацаваныя новыя падыходы па даванні адтэрміноўкі і растэрміноўкі выплаты запазычанасці па плацяжах у бюджэт. У адрозненні ад існуючага парадку, для атрымання адтэрміноўкі і растэрміноўкі плацельшчык павінен будзе закласці ў залог маёмасць, даць банкаўскую гарантыю або паручыцельства.

У законапраекце больш дакладна выкладзены механізм правядзення камеральных праверак. Калі падатковы орган выявіць парушэнне, ён накіруе патрабаванне плацельшчыку з указаннем ліквідаваць запазычанасць добраахвотна на працягу 10 дзён. Калі гэта адбываецца, або плацельшчык пераканаўча тлумачыць, чаму сведчанні ў яго дэкларацыі не супадаюць з тымі, якія мае інспекцыя, пакаранне не выкарыстоўваецца.

«Усе нашы дзеянні накіраваны на выбудоўванне партнёрскіх адносін з плацельшчыкам, каб падаткі плаціліся, у першую чаргу, добраахвотна, па-другое, каб гэтыя адносіны былі больш цывілізаванымі», — падкрэсліла спікер.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

### ❍ У ТЭМУ

Мінфін ацэньвае страты бюджэту ў 2019 годзе ад падатковага манеўру ў нафтавай сферы Расіі ў Br600 млн, паведаміў таксама Дзмітрый Кійко.

Страты чакаюцца ад скарачэння вывазных мытных пошлін на нафтапрадукты, закладзена 25-працэнтнае зніжэнне ставак акцызаў на паліва. Гэтыя абставіны абмяжоўваюць магчымасці па зніжэнні падатковай нагрузкі ў Беларусі.

У сярэднетэрміновай перспектыве гэтыя рызыкі трэба мінімізаваць, што магчыма вырашыць пры прапрацоўцы комплексных пытанняў магчымай падатковай рэформы.

Дзмітрый Кійко таксама расказаў, што Беларусь пачынае кансультацыі з расійскім бокам наконт наступстваў падатковага манеўру для эканомікі нашай краіны. Беларускі бок не выключае, што цяперашняя сітуацыя прывядзе да немагчымасці функцыянавання адзінага рынку нафтапрадуктаў у ЕАЭС. «Рэалізуючы падатковы манеўр, паралельна Расійская Федэрацыя ўводзіць у сябе новыя механізмы субсідавання ўласных перапрацоўшчыкаў нафты, так званы адмоўны акцыз, для якога ў нас крыніц няма», — заўважыў Дзмітрый Кійко.

У выніку можа скласціся непрапарцыйны рынак паліва: у Беларусі яно будзе значна даражэйшае, чым у Расіі. «Ва ўмовах адкрытай мяжы гэта прывядзе да неканкурэнтных умоў, па сутнасці, расійскія нафтапрадукты будуць выцясняць беларускія з нашага рынку. Таму яшчэ адзін варыянт — правядзенне кансультацый для пошуку магчымых кампенсацыйных механізмаў у рамках міждзяржаўных адносін для ўстанаўлення і захавання роўных канкурэнтных умоў» , — адзначыў намеснік міністра.

■ Парламенцкі дзённік

# Не патануць у дробязях

## У цэнтры ўвагі дэпутатаў будзе фарміраванне бюджэтнай і падатковай палітыкі

**Аб гэтым учора заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА на пасяджэнні Савета, на якім абмяркоўвалі напаўненне восеньскай сесіі.**

Спікер адзначыў, што на сённяшні момант у Палаце прадстаўнікоў знаходзіцца 37 законапраектаў, а да пачатку сесіі іх колькасць значна вырасце. 20 законапраектаў будуць разглядацца ў другім чытанні, значыць яны павінны быць абавязкова прыняты восенню.

«Час, які застаецца, неабходна максімальна выкарыстоўваць для таго, каб да наступнага пасяджэння Савета палаты, якое пройдзе ў верасні і дзе будзе разгледжаны праект парадку дня асенняй сесіі, мы падышлі з пакетам узгодненых законапраектаў. Неабгрунтаваных зацяжак і фармальнага стаўлення да законапраектнай работы быць не павінна», — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка.

Як адзначалася вышэй, у прыярытэце — блок пытанняў, звязаных з фарміраваннем бюджэтнай і падатковай палітыкі. На думку спікера, тут асноўны акцэнт неабходна зрабіць на рэалізацыі рашэнняў Прэзідэнта па стымуляванні дзелавой ініцыятывы грамадзян, падтрымцы сярэдняга і малога бізнесу, фарміраванні збалансаванага, зразумелага людзям і суб'ектам гаспадарання падатковага заканадаўства. «Пры гэтым самым уважлівым чынам варта падысці да выканання дзяржавай сваіх сацыяльных абавязацельстваў. Неабходна шчыльна працаваць з урадам у рамках міжведамасных груп, ужо зараз уносіць і адстойваць свае прапановы, каб пасля афіцыйнага ўнясення пакета законапраектаў у частцы бюджэту, падаткаў у Палату прадстаўнікоў мы не патанулі ў дробязях, а маглі сканцэнтравацца на разглядзе канцэптуальных пытанняў», — дадаў Уладзімір Андрэйчанка.

Як расказаў журналістам **намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Баляслаў ПІРШТУК**, ёсць цэлы блок досыць складаных законапраектаў. «Напрыклад, Жыллёвы кодэкс, у які будзем чарговы раз уносіць змяненні, Працоўны кодэкс — гэта тыя нарматыўныя дакументы, якія, па сутнасці, датычацца ўсяго насельніцтва краіны, — сказаў ён. — Гэтым разам у нас будзе разглядацца пяць законапраектаў, якія ўнесены па ініцыятыве нашых дэпутатаў. Нам хацелася б, каб дэпутаты працавалі больш актыўна. Яны лепш адчуваюць свае акругі, настроі і патрэбы людзей. Два з іх [з законапраектаў] датычацца эканамічнага блока — гэта інвестыцыі і прыватызацыя, тры — прыродаахоўнага характару».

Таксама віцэ-спікер дадаў, што будзе разгледжаны абсалютна новы законапраект аб арганічнай прадукцыі. На яго думку, для Беларусі ён вельмі важны, бо гэта дасць магчымасць атрымаць якасныя прадукты без прымянення хіміі. Зараз адпрацоўваюцца ўсе нюансы, каб гэты законапраект быў прыняты ўжо ў ходзе будучай сесіі.

Баляслаў Пірштук звярнуў увагу, што ёсць і досыць няпростыя законапраекты па дарожным і аўтамабільным руху, па электронных подпісах і рэгістры насельніцтва. Акрамя таго, у Палаце прадстаўнікоў плануюцца парламенцкія слуханні па шэрагу тэм, сярод якіх — турыстычная і інвестыцыйная прывабнасць Беларусі.

Вядома, гаворка зайшла і аб праекце Падатковага кодэкса. «Пакуль ён да нас не паступіў, але ўрад заканчвае гэтую работу. Я мяркую, што недзе ў верасні ён да нас паступіць, потым цэлы бюджэтны пакет яшчэ будзе па 2019 годзе — гэта вельмі сур'ёзныя дакументы, — сказаў віцэ-спікер. — Падатковае заканадаўства, я думаю, толькі лянівы не абмяркоўвае. Усім хацелася б паслаблення, але разам з тым нам усім хацелася б, вядома, знайсці механізмы напаўнення бюджэту. Добра прымаць нейкі льготны пакет, калі добрая напаўняльнасць бюджэту».

Што да ўмоў для малога і сярэдняга бізнесу, то, на думку намесніка старшыні Палаты прадстаўнікоў, трэба ўсё максімальна спрасціць. «На мой погляд, у нас заканадаўства перагружана, вельмі шмат рознай справаздачнасці, вельмі шмат розных рэвізій, кантрольных функцый. Усе, асабліва нашы бізнес-супольнасці, сыходзяцца на тым, што трэба гэты блок разгрузіць, — дадаў Баляслаў Пірштук. — Я згодны: нам трэба папрацаваць над тым, каб заканадаўства было зразумелае, празрыстае і каб рызык было менш у тых, хто вядзе бізнес».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Па Ізраілю выпусцілі 150 ракет



Баевікі ХАМАС выпусцілі па тэрыторыі Ізраіля з сектара Газа каля 150 ракет. Пра гэта ў Twitter паведаміла прэс-служба Арміі абароны Ізраіля. Удакладняецца, што 25 снарадаў былі перахопленыя сістэмай супрацьракетнай абароны «Жалезны купал». Сірэны паветранай трывогі спрацоўвалі ў 19 населеных пунктах Ізраіля. Большая частка ракет упала ў незаселенай мясцовасці. Ізраільская авіяцыя ў адказ нанесла ўдары па больш чым 140 ваенных аб'ектаў ХАМАС у Газе. Сярод іх штабы, тунэлі, трэніровачныя лагеры, арсеналы, палігоны, а таксама фабрыка па вытворчасці жалезабетонных канструкцый і некалькі пазіцый баевікоў. Напружанне на мяжы сектара Газа захоўваецца з сакавіка 2018 года.

### Эквадор увёў рэжым надзвычайнага становішча з-за прытоку венесуэльскіх мігрантаў

Улады Эквадора ўвялі рэжым надзвычайнага становішча ў трох правінцыях краіны ў сувязі з прытокам мігрантаў з Венесуэлы. Адпаведная заява размешчана на сайце эквадорскага МЗС. Па звестках ведамства, надзвычайнае становішча ўводзіцца ў сталічнай правінцыі Пічынча, а таксама правінцыях Карчы і Эль-Ора, якія мяжуюць з Калумбіяй і Перу адпаведна. Рэжым будзе дзейнічаць на працягу жніўня, але можа быць прадоўжаны, калі ўзнікне неабходнасць. Штодня ў Эквадор прыбывае да 4,2 тысячы венесуэльцаў, паведамляе МЗС. У названыя раёны будуць накіраваныя дадатковыя сілы міграцыйнага кантролю, медыкі, псіхолагі і сацыяльныя работнікі. Міжнародныя арганізацыі гатовыя даць ваду, харчовыя пайкі, прадметы гігіены і палаткі.

### Знайшліся нашчадкі Моны Лізы



Сёстры Строцы называюць сябе прамымі нашчадкамі адной з самых вядомых жанчын у гісторыі, перадае Euronews. «Бабуля заўсёды гаварыла пра наша з ёй [Монай Лізай] сваяцтва. Але мы ніколі не надавалі гэтаму вялікага значэння. Да таго часу, пакуль наш сябар, гісторык Дамяніка Савіні не вырашыў вывучыць нашы архівы», — расказвае адна з сёстраў. Сям'я Строцы — старадаўні род з Фларэнцыі, у эпоху Рэнесансу параўнацца з яго магутнасцю маглі толькі Медычы. Але вядомасць Строцы прынесла менавіта муза да Вінчы. Прафесар гісторыі мастацтваў з універсітэта Фларэнцыі Рэб Хэтфілд, які прысвяціў вывучэнню творчасці да Вінчы 15 гадоў, пагадзіўся з заявай сясцёр Строцы і адзначыў, што яны могуць з упэўненасцю лічыць сябе нашчадкамі Моны Лізы.

# СЕЛЕКЦЫЯ ПАСКАРАЕЦЦА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Беларусь знаходзіцца не ў самай спрыяльнай зоне для вядзення сельскай гаспадаркі. Для атрымання адзінкі раслінаводчай прадукцыі нам трэба ўкласці на 20 працэнтаў больш, чым у Польшчы, на 50 працэнтаў больш, чым у Германіі, і ў два разы больш, чым у Злучаных Штатах, — заўважае **намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па земляробстве Эрома УРБАН.** — Вы самі бачыце: нягледзячы на тое, што сёлета былі вытрыманы ўсе тэхналагічныя ўмовы, унесена дастатковая колькасць угнаенняў, праведзена абарона, мы некалькі не дабяром той валавы збор, які намячалі ў пачатку агранамічнага года, — у маі—чэрвені не было ападкаў, запас вільгаці наблі-жаўся да крытычнай адзнакі». Зразумела, такія рызыкі трэба ўлічваць. І на думку вучонага, адмова ад пасеваў азімага жыта (найбольш адаптаванага і прыстасаванага да кліматычных «сюрпрызаў») — няправільны кірунак у развіцці гаспадарак, асабліва Гомельскай вобласці. Гэта культура лічыцца страхавой не толькі ў Беларусі, але ва ўсім свеце, — заўважае Эрома Пятровіч. — Для прыкладу ў Польшчы азімае жыта займае 1 мільён 200 га, у нас гэты паказчык значна меншы.

Сярод праблем, над вырашэннем якіх працуюць вучоныя, — недахоп зернебабовых культур. Так, каб атрымліваць збалансаваныя па бялках кармы, іх неабходна вырошчваць на плошчах 300—350 тысяч гектараў. І сёння навукоўцы працуюць з такімі культурамі, як лубін, раянавалі новыя сарты гароху. За апошнія гады створаны і ўласныя гібрыды кукурузы, у выніку мы атрымліваем больш таннае насенне гэтай культуры і можам эканоміць валюту, якая раней ішла на закупку падобнага насення з-за мяжы.

## Меню для рагулі

Над пытаннямі, як павялічыць прадукцыйнасць жывёлагадоўлі, укараніць новыя селекцыйныя і рэсурсазберагальныя тэхналогіі, працуюць даследчыкі Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па жывёлагадоўлі.

Сумесная мэтанакіраваная работа з Мінсельгасхарчам і племяннымі прадпрыемствамі краіны дазволіла вывесці дзве новыя заводскія лініі галштынскай папуляцыі малочных кароў айчыннай селекцыі, якія вызначаюцца высокім узроўнем малочнай прадукцыйнасці і развіцця.

Пры Мінсельгасхарчы створана камісія па апрабацыі ліній з удзелам прадстаўнікоў племянных гаспадарак, аграрных ВНУ краіны. Таксама ў найбліжэйшы час плануецца атрымаць яшчэ дзве новыя лініі. Уся гэта работа скіраваная на стварэнне да 2020 года новай пароды Белгалштын.

У галіне мясной жывёлагадоўлі распрацавана праграма стварэння селекцыйных статкаў абердзін-ангускай пароды для вывядзення адаптыўных заводскіх ліній з выкарыстаннем сучасных дасягненняў генетыкі.

Трэба сказаць, што вучоных хвалююць і пытанні ўтрымання буйной рагатай жывёлы. Так, у хуткім часе плануецца распачаць будоўлю новай фермы, адаптаванай пад патрэбы жывёл. Распрацаваны новыя рашэнні, звязаныя з вентыляцыяй памяшканняў, даеннем кароў на рабатызаванай каруселі, будзе выкарыстана аўтаматычнае кармленне жывёл. Нават планіроўка «падбіралася» так, каб палепшыць біялагічны стан жывёл.

Ужо распрацавана і прайшла дзяржаўную экспертызу праектна-каштарысная дакументацыя на будаўніцтва гэтага інавацыйнага малочна-таварнага комплексу на 1000 дойных кароў з замкнёным цыклам у РУПП «Вусце» НАН Беларусі Аршанскага раёна на 2017— 2025 гады.

Каб вырашыць праблему раслінна-га бялку ў кармленні буйной рагатай жывёлы, вучоныя выкарысталі шматкампанентныя бабова-злакавыя травастоі, у склад якіх уваходзяць сумесі насення канюшыны, люцэрны, райграсу, цімафееўкі і фесталоліума. Такое багацце бабовых кампанентаў дазваляе забяспечыць малочную галіну кармамі насычанымі пратэінамі. Такі рацыён павялічвае малочную прадукцыйнасць кароў, памяншае выдаткі кармоў на 5-7 працэнтаў, зніжае захворванні жывёл.

Біятэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца ў жывёлагадоўлі, дазваляць паскорыць селекцыйны працэс. Так, як паведаміў **намеснік дырэктара па навуцы Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па жывёлагадоўлі Аляксандр БУДЗЕВІЧ,** цэнтрам па ўзгадненні з племянной службай краіны на пастаяннай аснове вядзецца работа па трансплантацыі эмбрыёнаў буйной рагатай жывёлы ў вядучых племзаводах краіны. У перспектыве нават прымяненне тэхналогіі перасадкі зародышаў.

Укараняюцца ў жывёлагадоўлі і новыя інфармацыйныя тэхналогіі. Па заказе Мінсельгасхарча цэнтр распрацоўвае комплекс праграмна-тэхнічных сродкаў дзяржаўнай інфармацыйнай сістэмы ў галіне племянной справы, стварае праграмнае забеспячэнне для цэнтраў селекцыі і генетыкі ў свінагадоўлі, для племянных гаспадарак.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**




## Надвор'е

# У ВЫХАДНЫЯ СПЯКОТА АДСТУПІЦЬ. НЕНАДОЎГА

**У Беларусі ў выхадныя спякота спадзе і пройдуць кароткачасовыя дажджы, паведамілі карэспандэнту БелТА ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Дзякуючы антыцыклону апошні дзень працоўнага тыдня, 10 жніўня, будзе гарачы і ў асноўным без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 11 градусаў па ўсходзе да плюс 19 па захадзе краіны, днём будзе 25—30 цяпла, па паўднёвым захадзе краіны паветра прагрэецца да 32 градусаў.

У гэтыя выхадныя атмасферны фронт, які змяшчаецца з Заходняй Еўропы, абумовіць кароткачасовыя дажджы і ненадоўга аслабіць спякоту, канстатавалі ў Белгідрамецы.

У суботу, 11 жніўня, ноччу ў заходніх, а днём і ў цэнтральных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы рознай інтэнсіўнасці. Месцамі прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 12—19 градусаў цяпла, днём у асноўным плюс 25—31, толькі па паўночным захадзе краіны яна паднімецца не вышэй за 19—24 градусы цяпла.

У нядзелю, 12 жніўня, ноччу пад уплывам франтальнага падзелу на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы рознай інтэнсіўнасці. Днём у асобных раёнах таксама не абыдзецца без кароткачасовых дажджоў. Месцамі прагрымяць навальніцы, днём у асобных раёнах — з парывістым ветрам. Тэмпература паветра ўначы складзе 12—18 градусаў цяпла, днём плюс 20—27.

У пачатку наступнага тыдня тэрыторыя Беларусі зноў апынецца пад уплывам антыцыклону, дажджы малаверагодныя, а тэмпературны фон пачне павышацца.

У панядзелак, 13 жніўня, будзе пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 10—17 цяпла, днём плюс 22—28, па паўднёвым захадзе краіны паветра прагрэецца да 30 градусаў.

У аўторак, 14 жніўня, прагназуецца пераважна без ападкаў, толькі раніцай і днём у заходніх раёнах рэспублікі магчымыя кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах будзе слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 12—19 градусаў цяпла, днём плюс 27—32.

«Вада ў рэках і вадаёмах Беларусі ўжо добра прагрэлася, тэмпература вады ў асноўным складае плюс 21—24, на рацэ Прыпяць вада прагрэлася да 24—26 градусаў. Акрамя таго, у сувязі з гарачым і сухім надвор'ем устанавілася высокая пажаранебяспека лясоў, будзьце асцярожныя з агнём», — праінфармавалі ў Белгідрамецы

## Новыя кнігі

# Жыццё праходзіць у вандроўках

**Выдавецтва «Мастацкая літаратура» прадоўжыла творчы праект «Светлыя знакі: паэты Кітая». Новы зборнік вершаў — «Подых усходняга сілу» Су Шы.**




Кніга выйшла на кітайскай і беларускай мовах. Вершы паэта XI стагоддзя на беларускую пераўвасобілі Алесь Емяльянаў-Шыловіч, Навум Гальпяровіч, Вераніка Жукавец, Юлія Алейчанка, Таццяна Сівец. Пераклады здзейснены па падрадкоўніках з мовы арыгінала. Сёння ў Кітаі паэзію Су Шы любіць вытанчаны, адукаваны чытач, які ўмее разгледзець колеры жыцця. Вопытны чыноўнік, мастак слова ўсё ж меў славу праўдашукальніка, рэаліста, здольнага правільна ацэньваць час і дзеі тых асоб, што кіравалі краінай, асобныя яе рэгіёнамі. З пасады памочніка першага міністра Ван Аньшы з-за нязгоды з рэалізацыяй так званага новага палітычнага курса Су Шы быў звольнены і перабраўся з Пекіна ў Ханчжоў. Затым паэт служыў у іншых гарадах, правінцыях і за свае палітычныя, грамадскія погляды меў надзвычайнае адабрэнне ад простага люду. Прайшоў творца і выпрабаванне турмой, дзе, абыйганы, правёў 103 дні. Пасля атрымаў мянушку «Пустэльнік Дунпо». Калі ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» разглядалі пытанне пра выбар новага аўтара серыі, кітайскія калегі (і найперш — доктар філалагічных навук Чжан Хуэйцінь з Другога Пекінскага ўніверсітэта замежных моў) параілі спыніцца на творчасці Су Шы. Дарэчы, у серыі «Светлыя знакі: Паэты Кітая» існуе міжнародны рэдакцыйны савет, у які ўваходзяць і прадстаўнікі навуковай і творчай інтэлігенцыі Кітая — Лю Сулін, Цай Цзяньфэнь, Чжан Хунбо, Лю Мяа, Чжан Хуэйцінь. Да нядаўняга часу актыўна развіццю серыі спрыяў славуты кітайскі перакладчык Гаа Ман. Перакладчык Максіма Танка, Святланы Алексіевіч, Саюзам пісьменнікаў Беларусі ён адзначаны знакам «За вялікі ўклад у літаратуру».

Варта нагадаць, што зборнік вершаў «Подых усходняга сілу» — дванаццатая кніга серыі «Светлыя знакі: Паэты Кітая», якая ўключна да дзясятай кнігі выходзіла ў Выдавецкім доме «Звязда». Аўтары серыі — Ван Вэй, Ай Цін, Ду Фу, Лі Бо, Лі Хэ, Лі Цінчжаа, Ван Гачжэнь, Мэн Хаажань, Сюй Чжымо, Вэнь Ідо. Асобна ў зборніку «Храм на гары» выйшлі пераклады кітайскай паэзіі, якія ажыццявіў народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін.

**Сяргей ШЫЧКО**

## Бяда

# ПАЙШОЎ НА ДНО, РАТУЮЧЫ ДЗЯЎЧЫНУ...

**Як паведамілі ў Пінскай гарадской арганізацыі ратавання на водах, няшчасны выпадак адбыўся прыкладна ў 17.00.**

Паводле папярэдняй інфармацыі, кампанія маладых людзей адпачывала за горадам на беразе Прыпяці. Нягледзячы на тое, што купацца ў гэтым месцы забаронена, двое з кампаніі забаўляліся скачкамі з тарзанкі і прапанавалі скокнуць дзяўчыне, якая знаходзілася з імі.

Спачатку яна адмовілася, паколькі не ўмела плаваць, але хлопцы яе ўгаварылі. Пасля скачка ў ваду дзяўчына стала тануць. Маладыя людзі паспрабавалі яе выратаваць, але самі пайшлі на дно.

Людзі, што адпачывалі побач, выклікалі ратавальнікаў і дапамаглі выбрацца дзяўчыне і аднаму хлопцу.

Работнікі выратавальнай станцыі дасталі з вады цела юнака 2001 года нараджэння. Да прыбыцця хуткай медыцынскай дапамогі ратавальнікі праводзілі рэанімацыйныя мерапрыемствы, але вярнуць хлопца да жыцця не атрымалася.

У 17.55 медыкі канстатавалі яго смерць.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

## Без бюракратызму і толькі па справах

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 11 жніўня ў Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах. Уладны будуць адказваць на пытанні жыхароў краіны з 9.00 да 12.00.**

старшыня БРЭСЦКАГА аблсавета дэпутатаў Юрый Іосіфавіч НАРКЕВІЧ. Тэл. 8 016 221 31 21;

першы намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8 021 222 22 22;

першы намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Аляксандр Віктаравіч МІКАЛУЦКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;

кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Андрэй Міхайлавіч КУНЦЭВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

кіраўнік спраў МІНСКАГА гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАЦЕЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Глуша Адамовіча

*«Звязда» працягвае друкаваць матэрыялы ў падтрымку адкрыцця ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна музея, прысвечанага творчасці Алеся Адамовіча.*

# ГЛУША ПАЧНЕЦЦА З АДАМОВІЧА

## Першы прыпынак пасёлка з боку Бабруйска ў будучым атрымае імя пісьменніка

**Непрыкметна прайшоў чарговы дзень нараджэння пісьменніка, ужо 25-ы без яго ўдзелу. Алесь Адамовіч нарадзіўся менавіта 3 жніўня, хоць афіцыйна гэты дзень адзначаецца 3 верасня. Дата, якую для яго прыдумала маці, каб падмаладзіць сына і выратаваць яму жыццё. Беларускі класік зрабіў шмат для таго, каб пра яго «малую радзіму» даведалася як мага болей людзей.**

Цяпер стаіць задача папулярызаваць месца, дзе прайшло дзяцінства будучага пісьменніка і адкрыць музей. Збор сродкаў на рэканструкцыю пад яго аўтэнтычнага будынка аптэкі, які ў гады вайны быў яшчэ і цэнтрам народнага супраціўлення ворагу, працягваецца. А паралельна ствараюцца іншыя сімвалічныя аб'екты. У маі на сайце Бабруйскага райвыканкама з'явілася прапанова прыняць удзел у конкурсе на афармленне аднаго з прыпынкаў пасёлка ў адамовіцкім стылі. Нядаўна мы даведаліся, што работа над увасабленнем у жыццё гэтага праекта пачалася.

На сайце райвыканкама паведамлялася, што конкурс праводзіцца з мэтай ушанаваць памяць Алеся Адамовіча і прыцягнуць увагу да Глушы як месца, дзе можа з'явіцца паўнавартасны турыстычны комплекс, прысвечаны пісьменніку. Прыемна паведаміць, што аўтарам ідэі стварэння такога конкурсу і яе рэалізатарам стаў ужо добра нам знаёмы па папярэдняй публікацыі бабруйчанін



Чым не пляцоўка да будучага помніка?

Андрусь Архіпенка, той самы, які назбіраў грошай на помнік Алесю Адамовічу. Ёсць спадзяванні, што бюст у найбліжэйшыя некалькі месяцаў усталююць.

— Грошы народныя, і я бачу гэты помнік выключна каля будынка аптэкі, — выказала сваё меркаванне дачка пісьменніка Наталля Адамовіч. — З гэтым згодны і аўтар помніка, скульптар Генадзь Лойка. Там якраз ёсць месца, дзе з часам можна будзе стварыць літаратурны сквер, паставіць альтанкі і лаўкі. Нідзе болей у Глушы няма такога зручнага месца для будучых творчых сустрэч.

Паралельна вядзецца работа над стварэннем «адамовіцкага» прыпынку.

Андрусь паведаміў, што на конкурс паступіла каля 20 ідэй. Усе іх плануецца задзейнічаць, бо ў кожнай ёсць нешта цікавае. Вырашана зрабіць прыпынак «нулявым кіламетрам», ад якога будуць паказальнікі да дома, дзе пэўны час жыў Алесь Адамовіч, вуліцы, названай у яго гонар, да могілак, дзе ён пахаваны, да помніка, іншых мясцін, звязаных з гэтым пісьменнікам. Усё робіцца для таго, каб нават турысты-адзіночкі змаглі самастойна прайсціся па адамовіцкіх мясцінах і не заблукаць.

— Ідэя з прыпынкам вельмі цікавая, — адзначыў **Ігар ЛЕПЯШКОЎ, начальнік ДЭУ № 72,** якое займаецца абслугоўваннем дарог у Бабруйскім раёне. — Мы ж падрыхтуем прыпыначны павільён для нанясення на яго малюнка. У нашы абавязкі ўваходзіць таксама падтрыманне парадку на гэтай тэрыторыі. Так што прыпынак будзе пад наглядам.

Да праекта праявіў цікавасць мастак Аляксандр Благій. Гэта імя добра знаёма прыхільнікам стрыт-арта. Дзякуючы такім як ён, нашы дамы атрымліваюць свой індывідуальны выгляд і становяцца своеасаблівым брэндам той ці іншай мясцовасці. На чарзе — стварэнне брэнда для Глушы.

Праз месяц яшчэ адзін, пашпартны, дзень нараджэння пісьменніка. **Намеснік старшыні Бабруйскага райвыканкама Таццяна ВАРАНКО** паведаміла, што ў пасялковым Доме культуры пройдзе прысвечанае гэтай даце мерапрыемства. Яна таксама адзначыла, што рыхтуецца праект па адкрыцці ў Доме культуры музейнага пакоя ў гонар пісьменніка. Але што там будзе канкрэтна, Таццяна Аляксандраўна рассакрэчваць пакуль не стала.

Што датычыцца збору сродкаў на рэканструкцыю самога будынка аптэкі, то працэс працягваецца. Сёлета, напрыклад, пакуль толькі адзін чалавек папоўніў скарбонку на 20 рублёў. Агульная сума, якая зараз знаходзіцца на рахунку, па інфармацыі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бабруйскага райвыканкама, складае 11 831,45 рубля.

Трэба сказаць, што цікавасць да асобы пісьменніка павялічваецца. У Бабруйску, напрыклад, арганізавалася нешта накшталт суполкі прыхільнікаў, якія вывучаюць яго літаратурныя і экранныя творы і перыядычна абмяркоўваюць у папулярным сярод моладзі антыкафэ «Тайм-клуб». Нядаўна, напрыклад, маладыя людзі дзяліліся паміж сабой думкамі наконт аповесці «Нямко». А ў гэтую нядзелю прайшла сустрэча з дачкой пісьменніка — Наталляй Адамовіч. Размова працягвалася дзве з паловай гадзіны. Было шмат пытанняў наконт жыцця і творчасці пісьменніка. Самыя актыўныя мелі магчымасць атрымаць з рук Наталлі Аляксандраўны кнігу з дарчым надпісам. Прысутныя казалі, што ў Глушы дагэтуль захоўваецца своеасаблівая адамовіцкая аўра.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

***Збор сродкаў на музей працягваецца. Далучыцца да добрай справы можаце і вы. Разліковы рахунак існуе пры аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бабруйскага райвыканкама***

***р/с BY84AKBB36421292723267100000 у філіяле 703 ААТ «ААБ Беларусбанк», БІК AKBBBY21703, УНП 701226324.***

***Прызначэнне плацяжу: «Для вырабу праектна-каштарыснай дакументацыі і рэканструкцыі будынка ў пасёлку Глуша пад музей А. Адамовіча». Гэты доўгі сказ павінен быць пазначаны ў банкаўскім дакуменце абавязкова.***

Standard.by

**ООО «Центр эксперт-услуг плюс» (организатор аукциона) проводит повторный открытый аукцион (цена снижена на 15 %) по продаже имущества, принадлежащего ООО «Альком» (Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Малинина, 38):**

– автовышка ЗИЛ 130 МШТС-4М, 1983 г. в., рег. № EI 0009, с начальной ценой 6324,00 руб.

– подъемник ЗИЛ 133 ГЯ (АГП 22.03), 1990 г. в., рег. № ЕВ 8008, с начальной ценой 11118,00 руб.

– автовышка ЗИЛ 131 ВС 222-01, 1985 г. в., рег. № 1665 ГСР, с начальной ценой 9996,00 руб.

– автокран МАЗ 5334 КС 3577, 1984 г. в., рег. № ЕА 6599, с начальной ценой 7242,00 руб.

– трактор МТЗ-82, 1992 г. в., рег. № ЕА 6185, завод № 358015 с начальной ценой 8466,00 руб.

– трактор МТЗ-82, 2002 г. в., рег. № ЕВ-3 1955, завод № 374120 с начальной ценой 13566,00 руб.

– автомобиль ГАЗ 33021,1996 г. в., рег. № ЕМ 3390, с начальной ценой 4692,00 руб.

– автомобиль ЗИЛ 332400, 2001 г. в., рег. № ЕВ 4080, с начальной ценой 3876,00 руб.

– самосвал ЗИЛ 4502, 1990 г. в., рег. № ЕВ 4247, с начальной ценой 6018,00 руб.

– самосвал ЗИЛ-ММЗ-45021, рег. № ЕМ3067, с начальной ценой 4590,00 руб.

– автомобиль – цистерна ЗИЛ 431412, 1994 г. в., рег. № АВ 1609 – 3, с начальной ценой 7446,00 руб.

– автобус МАЗ 103 002,2003 г. в., рег. № АК 6041-3, с начальной ценой 22950,00 руб.

– автобус IKARUS 256, 1990 г. в., рег. № АК 6008-3, с начальной ценой 7854,00 руб.

– грузовой автомобиль МАЗ 54323, 1998 г. в., рег. № АК 6007-3, с начальной ценой 5406,00 руб.

– монтажный кран гусеничный МКГ-25 БР, 1986 г. в., завод № 4035, с начальной ценой 32232,00 руб.

– пневмоколесный кран КС 5363, 1989 г. в., завод. № 4552, с начальной ценой 26520,00 руб.

– аппарат высокого давления Blue Clean AR 1125, инв. № 206, с начальной ценой 3876,00 руб.

Все цены указаны с НДС.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены продажи;

Задаток – 10 % от начальной цены продажи;

Задаток перечисляется на расчетный счет р/с BY33PJCB30124047901000000933 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 400 г. Гомель, БИК PJCBBY2X, УНП 491331464, получатель платежа ООО «Центр эксперт-услуг плюс», назначение платежа: задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 10.08.2018 г.

Аукцион состоится 24 августа 2018 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Старочерниговская, 7а. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 22 августа 2018 г. до 14.00 по указанному адресу.

Перечень документов, необходимых для участия в аукционе, порядок проведения аукциона и оформления его результатов, дополнительная информация о предмете аукциона размещены на сайте **www.auction.standard.by**.

Участник, ставший победителем аукциона или единственным участником аукциона, который согласится приобрести предмет аукциона по начальной цене продажи, увеличенной на 5 %, обязан:

в течение 3 (трех) рабочих дней после подписания в день проведения аукциона протокола о результатах аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона. В течение 10 (десяти) рабочих дней после подписания в день проведения аукциона протокола о результатах аукциона заключить с Собственником договор купли-продажи; произвести окончательную оплату в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи.

Результаты аукциона подлежат аннулированию организатором в случае, если победитель аукциона уклоняется или отказывается в установленные сроки от подписания протокола и (или) договора, оформляемого по результатам аукциона, возмещения затрат, связанных с организацией и проведением аукциона.

Тел.: +375 (232) 21 21 61, + 375 (29) 303 39 33.

По вопросам осмотра имущества тел.+375 (29) 619 16 15.

E-mail: info@standard.by

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Мядельагросервис» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **здания пункта технического обслуживания общей площадью 3 976,1 кв. м, инв. № 633/С-14174, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624050100001001857 площадью 0,9345 га** (предоставлен на праве аренды по 2016), **по адресу: Минская область, Мядельский район, г. Мядель, ул. Промышленная, 1.** *Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 Вольт (0,0020 га).*

Начальная цена с НДС (20 %) – **88 800,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – 8 880,00 бел. руб.).

**Условия продажи:**

– улучшение эстетического вида объекта, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и наведение на нем порядка, в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества;

– поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);

– обращение в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество (в случае отчуждения незарегистрированного объекта – с даты подписания акта приема-передачи) в районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ (в случае необходимости ее разработки) либо информирование соответствующего исполнительного комитета в указанный срок об отсутствии такой необходимости;

– разработка проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ в срок не позднее 6 месяцев с момента получения разрешения, если иное не предусмотрено законодательством;

– проведение реконструкции (строительства) недвижимого имущества в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, с окончанием строительства не позднее 2-х лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество, если иное не установлено решением районного исполнительного комитета;

– использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством;

– запрет на отчуждение недвижимого имущества до его ввода покупателем в эксплуатацию.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение результативного аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **10.09.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.09.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

В суд Заводского района г. Минска поступило заявление об объявлении умершим Самца Сергея Николаевича, 29 декабря 1961 года рождения, уроженца города Минска, последнее известное место жительства – г. Минск, пер. 1-й Зимний, д. 6. Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о Самце С. Н., сообщить их суду Заводского района г. Минска в течение двух месяцев со дня опубликования объявления.

В суд Ганцевичского района поступило заявление об объявлении умершим Рекунова Романа Валерьевича,4 января 1977 года рождения, уроженца Железнодорожного района г. Ростова-на-Дону Ростовской области Российской Федерации, последнее место жительства г. Ганцевичи, ул. Октябрьская, д. 32, кв. 95, Брестской области.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о Рекунове Романе Валерьевиче, сообщить их суду Ганцевичского района по адресу: 225432, г. Ганцевичи, ул. Коммунистическая, д. 21 в течение двух месяцев со дня опубликования объявления.

Управляющий по банкротству ООО «Торговый дом «Конфа и ПК» (дело № 209-14Б/15 от 09.10.2015, экономический суд Минской области) УНП 690550269, г. Молодечно, ул. Городокская, 106А, 20, в лице директора ООО «ИПМ-Консалт эксперт» Малаховой Т. Л., сообщает о проведении собрания кредиторов по защите требований Каптюг В. Н. Собрание по защите требований состоится 20 августа 2018 г. в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 5, к. 2, оф. 1703. Определением от 02.08.2018 № 209-14Б/15 экономический суд Минской области обязал Каптюг В. Н. представить заявление о требовании на собрании кредиторов.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

<table>
<tr><td colspan="4">Извещение о проведении повторного аукциона</td></tr>
<tr><td>Организатор аукциона</td><td colspan="3">ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703</td></tr>
<tr><td>Продавец</td><td colspan="3">Воложинское районное потребительское общество, Минская обл., г. Воложин, ул. Партизанская, 30</td></tr>
<tr><td colspan="4">Предмет аукциона</td></tr>
<tr><td>Наименование</td><td>Назначение</td><td>Общ. пл.</td><td>Инв. номер</td></tr>
<tr><td>Здание пилорамы</td><td>Здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель</td><td>295,6 кв. м</td><td>632/С-27489</td></tr>
<tr><td colspan="4">Адрес предмета аукциона: Минская обл., Воложинский р-н, г. Воложин, пер. Советский, 9</td></tr>
<tr><td colspan="4">Сведения о земельном участке: общ. пл. 0,1039 га, предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания пилорамы</td></tr>
<tr><td colspan="4">Начальная цена с НДС 20 % – 14 424,48 бел. руб. (снижена на 20 %)</td></tr>
<tr><td colspan="4">Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»</td></tr>
<tr><td>Срок заключения договора купли-продажи</td><td colspan="3">15 рабочих дней после снятия продавцом зарегистрированных обременений по предмету аукциона в установленном законодательством Республики Беларусь порядке</td></tr>
<tr><td colspan="4">Условия оплаты предмета аукциона</td></tr>
<tr><td colspan="4">Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи</td></tr>
<tr><td colspan="4">Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by</td></tr>
<tr><td colspan="4">Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 27.06.2018</td></tr>
<tr><td colspan="4">Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия</td></tr>
<tr><td colspan="4">Аукцион состоится 27.08.2018 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 24.08.2018 до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by. Email: auction@cpo.by</td></tr>
</table>




## ДЗІВОСНЫ ПАРАСТАК

Цётцы Юзэфе гадоў пад 90, і ўвесь гэты час яна жыве ў невялікай вёсачцы. Школы тут ніколі не было, але чытаць і пісаць жанчына ўмее. Некалі скончыла чатыры класы. Болей, на жаль, не давялося, бо іх з братам, рана асірацелых, гадавала цётка — не аддала ў дзіцячы дом, хоць і ўгаворвалі... За гэта нельга было не аддзячыць. Вось Юзэфа і працавала: з дзяцінства — дома па гаспадарцы, а далей — болей: у калгасе на паляводстве, на ферме... Што цікава, з вёскі яна нікуды не выязджала, нават цягніка ў вочы не бачыла. Так і жыве тут адна, у той самай цётчынай хаце, трымае курэй, вырошчвае гародніну. Па гаспадарцы ёй дапамагае сацыяльны работнік, зрэдку ў госці наязджае пляменніца...

У гэтым месцы яму могуць запярэчыць: людзі далёка не пенсійнага ўзросту не могуць уладкавацца на працу, а гэты ўжо зарабіў сабе на хлеб да старасці, вось няхай цяпер і адпачывае.

У сваю чаргу, таксама хочацца ўставіць пяць капеек, прычым па адной манетцы:

— Майму заяўніку на выгляд ніяк больш за 60 не дасі, і нават не паварочваецца язык ужыць да яго азначэнні «стары» або «дзядуля» (відавочна, што свой працоўны патэнцыял яшчэ не растраціў).

— У Працоўным кодэксе НЯМА артыкула, дзе прычынай непадаўжэння працоўных адносін з'яўляецца паважны ўзрост работніка (тым больш што верхні парог працаздольнасці паступова павышаецца, і хай бы сабе чалавек працаваў, калі ён гэтага хоча). Да таго ж сёння мы прымушаем працаваць тых, каго называем утрыманцамі, у той час як не даём магчымасці працягваць працоўную дзейнасць таму, каго іншы наймальнік наўрад ці прыме на працу з-за ўзросту.

— Не за высокую ж кіруючую пасаду так трымаецца чалавек, а за самую простую, працоўную. Адна з прычын — недахоп сродкаў, бо чалавек жыве ў арэнднай аднапакаёўцы, за якую штомесяц (у залежнасці ад сезона) траціць ад 140 да 200 рублёў.

***— Вы ведаеце, мая пенсія складае 350 рублёў. Аддам за кватэру — застанецца 150 на месяц. Вы не падумайце, я з галоду не памру: перайду на хлеб з ліверкай, скардзіцца на жыццё не буду,*** — запэўнівае суразмоўца. — ***Але так хочацца яшчэ хоць з паўгода папрацаваць, асабліва цяпер, калі зарплату паднялі да 400 рублёў.***

— Работнікі пенсійнага ўзросту — адны з самых дысцыплінаваных і старанных (магчыма, савецкая загартоўка не прайшла для іх дарэмна).

***— Я ж ні разу не адмовіў майстру, каб выйсці на чужы ўчастак працы і ў любы час,*** — у пацвярджэнне гэтаму кажа заяўнік.

Аб гэтым я кожны раз успамінаю, калі ацэньваю працу нашага новага маладога дворніка, якога бачыла хіба што некалькі разоў. Тым часам як былая дворнічыха, каларытная цётка Манька, скардзілася аднойчы, што яе таксама адправілі на пенсію. Дык вось яна пачынала працаваць а пятай гадзіне кожную раніцу і нават рабіла гэта па суботах. Ад яе мятлы прачынаўся ўвесь двор, але жыхары не скардзіліся, бо разумелі, што наводзіць прыгажосць для нас: прыбірае лісце, ачышчае снег ці выносіць смецце, што пакінулі на лавачцы маладыя кампаніі.

І нарэшце, у якасці апошняга аргумента хочацца адзначыць, што памерці на рабочым месцы ад не звязаных з вытворчасцю прычын можна ў любым узросце. Проста паверце майму жыццёваму вопыту.

Чытач спытае: які вынік усёй гэтай гісторыі? Дэпутацкі запыт у адрас наймальніка з просьбай не пакідаць чалавека за мяжой беднасці прынёс свой плён. Вярнуць мужчыну на ранейшае месца ўжо было немагчыма, бо канчатковы разлік пры звальненні быў ажыццёўлены (якраз у дзень звароту) і на вакантнае месца ўжо бралі іншага дворніка. Але майму заяўніку прапанавалі месца ў ЖЭСе, непадалёк ад яго дома.

Словам, хэпі-энд, якіх, на жаль, у нашым жыцці не так ужо і шмат...

# АКЦЭНТ НА ЗАНЯТАСЦЬ

***(Заканчэнне.*** ***Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

Калі казаць пра афіцыйна зарэгістраванае беспрацоўе, то ў цэлым па краіне яно знізілася да 0,4 %. Толькі ў адным рэгіёне гэты паказчык дасягае 1 % — на Шаркаўшчыне.

У Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі хваляванне выклікае той факт, што па-ранейшаму колькасць звольненых работнікаў перавышае іх прыём. Так, у чэрвені гэта розніца склала 2,5 тысячы чалавек, у маі — 12 тысяч, у красавіку — 14 тысяч. У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны прагназуюць: такая тэндэнцыя будзе працягвацца і надалей, бо на прадпрыемствах ідзе мадэрнізацыя.

— Але тая статыстыка, якая публікуецца па прынятых і звольненых, робіцца толькі па буйных і сярэдніх прадпрыемствах — са штатам 100 і больш чалавек. Пры гэтым колькасць занятых практычна не змяншаецца: гэта сведчыць пра тое, што людзі ідуць у малы бізнес, самазанятасць, — каментуе **начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства Алег ТОКУН.**

## Улічыць усе нюансы

Каб стымуляваць занятасць, на пачатку года быў прыняты Дэкрэт № 1. Згодна з ім мясцовыя органы ўлады максімальна павінны садзейнічаць насельніцтву ў працаўладкаванні. Праводзіць індывідуальную работу па падборы вакансій, займацца рэсацыялізацыяй асоб, якія вядуць асацыяльны лад жыцця. Для гэтага стварылі пастаянныя камісіі, у склад якіх увайшлі дэпутаты, спецыялісты выканкамаў, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў. Акрамя таго, абласныя і Мінскі гарадскі Саветы дэпутатаў могуць дадаткова накіроўваць сродкі мясцовых бюджэтаў на рэалізацыю мерапрыемстваў у галіне занятасці на тэрыторыях з напружанай сітуацыяй на рынку працы.

База даных незанятых грамадзян фарміруецца цэнтралізавана Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны. Інфармацыя ў ёй будзе абнаўляцца раз на паўгода і актуалізавацца па выніках квартала. Доступ да гэтых звестак атрымаюць усе раённыя камісіі. Першую пробную базу зробяць да 1 верасня — яна дазволіць адпрацаваць механізм узаемадзеяння, улічыць памылкі. Канчатковая версія будзе сфарміравана да 1 снежня.

Грамадзяне, якія сядзяць без работы, будуць павінны з наступнага года аплачваць у поўным аб'ёме такія паслугі, як гарачае водазабеспячэнне, газазабеспячэнне пры наяўнасці індывідуальных газавых ацяпляльных прыбораў, цеплазабеспячэнне. Але не ўсе непрацуючыя будуць лічыцца ўтрыманцамі. Выключэнні прапісаны ў пастанове ўрада ад 31 сакавіка 2018 года № 239. Сярод іх бацькі, якія выхоўваюць дзіця да сямі гадоў, траіх і больш непаўналетніх, выпускнікі ўніверсітэтаў і каледжаў (да канца года, у якім атрымалі дыплом), алімпійскія чэмпіёны, якім выплачваюць дзяржстыпендыю, жонкі маладых спецыялістаў, калі ў мясцовасці, куды размеркавалі мужа, няма магчымасці працаўладкавацца, і іншыя катэгорыі.

Мінпрацы і сацабароны распрацавала таксама прыкладны пералік цяжкіх жыццёвых сітуацый, пры якіх грамадзян без работы могуць вызваліць ад аплаты паслуг па стапрацэнтным тарыфе. Спіс быў накіраваны ў аблвыканкамы і камісіі. Сітуацыі можна ўмоўна падзяліць на чатыры блокі. Першы — стан здароўя. Напрыклад, наяўнасць у чалавека захворвання, якое з'яўляецца паказаннем да ўстанаўлення інваліднасці, але яна з нейкіх прычын пакуль што не аформлена, працяглае аднаўленне пасля траўмы, праходжанне курса лячэння і рэабілітацыі ад нарказалежнасці.

Другі блок — неабходнасць догляду дзяцей, старэйшых за сем гадоў. Напрыклад, школьнік стаіць на дыспансерным уліку з хранічным захворваннем, навучаецца дома пасля хваробы. Трэці блок — неабходнасць пастаяннага ці часовага догляду дарослых непрацаздольных грамадзян. Чацвёрты — адсутнасць магчымасці працаўладкавання. Тут могуць быць такія аб'ектыўныя прычыны, як значная аддаленасць месца жыхарства ад органаў тэрытарыяльнай службы занятасці, нерэгулярная транспартная сувязь, адсутнасць вакансій па спецыяльнасці.

— Хачу адразу сказаць, што гэты пералік прыкладны, ён не закрыты. У камісіі застаецца права прымаць рашэнне па кожнай канкрэтнай сітуацыі, — дадае Алег Токун.

## Субсідыі прадпрымальнікам і стажыроўкі для моладзі

На думку Савета Рэспублікі, рашэннем праблем на рынку працы мусіць стаць стварэнне новых рабочых месцаў. Перавагу неабходна аддаваць высокавытворчым месцам.

Знізіць напружанасць на рынку дапаможа і арганізацыя самазанятасці. За паўгода 2018-га субсідыі на сваю справу атрымалі 923 беспрацоўныя. З іх 771 чалавек адкрыў прадпрымальніцкую дзейнасць, 143 сталі рамеснікамі, 9 заняліся аграэкатурызмам. Сярод тых, хто атрымаў фінансавую дапамогу на запуск уласнага бізнесу, 19,4 % пражывае ў сельскай мясцовасці, 27,5 % — у малых гарадах. Больш за ўсё прадпрымальнікаў з ліку беспрацоўных з'явілася ў Гомельскай вобласці — 215 чалавек.

— Крыху скарацілася колькасць зваротаў па субсідыі: за аналагічны перыяд летась іх атрымалі 1014 чалавек. Але ў гэтым няма нічога дрэннага: справа ў тым, што Дэкрэт № 7 даў магчымасць не рэгістраваць многія віды дзейнасці ў якасці ІП, а займацца імі, сплаціўшы адзіны падатак, — тлумачаць у міністэрстве.

Вялікая ўвага ўдзяляецца занятасці моладзі. Па выніках абследавання за май 2018 года, узровень фактычнага беспрацоўя сярод 16—30-гадовых складае 6,2 %. У лютым ён быў вышэйшы — 7,6 %.

— Трэба разумець, што частка моладзі вучыцца, частка знаходзіцца ў пошуках лепшага месца. Тэрмін працаўладкавання ў іх, як правіла, ніжэйшы, чым у сярэднім па краіне. Для параўнання: у Расіі маладзёжнае беспрацоўе складае 9—10 %, а ў некаторых краінах Еўропы можа дасягаць 25—30 %.

Спецыяльна для выпускнікоў каледжаў і ўніверсітэтаў ёсць праграма стажыроўкі для набыцця практычнага вопыту. Ім дапамагаюць уладкавацца па атрыманай спецыяльнасці, а наймальніку кампенсуюць частку налічанага заробку і падаткі. Праграмы навучання, якія прапануюць службы занятасці, таксама скіраваны на моладзь. Больш за 50 працэнтаў тых, хто атрымлівае новую прафесію на такіх курсах, — гэта грамадзяне да 30 гадоў.

Адна з ключавых праблем — дысбаланс попыту і прапановы.

— Усе краіны знаходзяцца ў пошуку таго, як узгадніць рынак працы і рынак адукацыйных паслуг. Што ў нас робіцца для гэтага? Галоўную ролю ў прагназаванні патрэбы эканомікі ў кадрах з гэтага года іграюць Мінпрацы і сацабароны і Мінэканомікі, — заўважае Алег Токун. — Менавіта мы будзем казаць сістэме адукацыі, колькі і якіх спецыялістаў неабходна навучаць у найбліжэйшай перспектыве, каб тыя, хто выпускаецца, былі запатрабаваны. Першы пробны прагноз будзе зроблены восенню гэтага года.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

# ГРОШЫ НА ВАШ БІЗНЕС

**Якія віды прадпрымальніцкай дзейнасці арганізуюць беспрацоўныя?**

Як паведамілі ў Мінпрацы, сёлета ў першым паўгоддзі субсідыі для арганізацыі сваёй справы атрымалі 923 беспрацоўныя, большасць з якіх — на арганізацыю прадпрымальніцкай дзейнасці.

Мы пацікавіліся, якія віды самазанятасці карыстаюцца большым попытам сярод тых, хто скарыстаўся фінансавай дапамогай. Як высветлілася, перавага аддаецца арганізацыі сваёй справы ў сферы рознічнага гандлю. Таксама былыя беспрацоўныя ахвотна аказваюць паслугі ў сферы будаўніцтва, электрамантажных, тынкавальных, сантэхнічных ды іншых работ, а яшчэ шмат прапаноў звязана з дзейнасцю аўтамабільнага грузавога транспарту і таксі.

Дарэчы, памер грашовай дапамогі для арганізацыі сваёй справы не заўсёды аднолькавы. Ён залежыць ад месца і віду занятку. Так, разлічваць на субсідыю ў памеры 11 бюджэтаў пражытковага мінімуму (з 1 жніўня бягучага года БПМ складае 213,67 рубля) могуць беспрацоўныя, якія ў сувязі са становішчам на рынку працы не маюць магчымасці атрымаць прыдатную працу і ствараюць найбольш значныя для сваёй мясцовасці віды прадпрымальніцкай дзейнасці, якія вызначаюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі. За першае паўгоддзе, напрыклад, такую субсідыю атрымалі 744 беспрацоўныя.

## Тэлесеткі

# «Еўрабачанне» выйшла на вуліцы

**Белтэлерадыёкампанія здымае відэавізітоўкі для ўсіх дзесяці фіналістаў нацыянальнага адбору на дзіцячае «Еўрабачанне-2018».**

Паводле слоў рэжысёра візітных картак Яны Шаблыкі, у кожным ролiку адбываецца пэўная цікавая гісторыя, якая абавязкова завяршаецца феерверкам з канфеці. «У кадры нашы фіналісты па-сапраўднаму запальваюць, у поўнай адпаведнасці са слоганам конкурсу акунаюцца ў казку, весяляцца і танцуюць», — дадала рэжысёр.

Нагадаем, фінальны гала-канцэрт пройдзе 31 жніўня ў прамым эфіры, а вось сюжэты пра юных артыстаў можна будзе ўбачыць напярэдадні ў эфіры праграмы «Добрай раніцы, Беларусь!».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

## ШАШКІ («звязда») Выпуск № 69

Для самастойнага рашэння ў шашкі-64 прапануюцца кампазіцыі вопытнага шашачнага кампазітара з Латвіі Генадзя Андрэева. Першыя дзве кампазіцыі складзены па правілах рускіх шашак, а трэцяя па правілах бразільскіх. У ёй для дасягнення перамогі белыя двойчы выкарыстоўваюць правіла «большасць» і канчаюць гульню прыёмам «слупняк на вялікай дарозе».

№ 52

Белыя простыя шашкі: а1, с7, d2, e1, f6, h2, h4 (7).

Чорныя простыя шашкі: а3, а7, е3, f2, f4, g3 (6).

№ 52



№ 53

Белыя простыя шашкі: b6, d2, e7, f6, g7 (5).

Чорныя простыя шашкі: а7, b2, b4, d4, e5, h8, чорныя дамкі: h4 (7).

№ 54

Белыя простыя шашкі: b6, c1, d6, e5, f6, g1, g5 (7).

Чорныя простыя шашкі: а7, c3, d2, e3, f2, g3, h4 (7).

У шашкі-100 пазіцыя складзена вядучым аддзела.

№ 55

Белыя простыя шашкі: 34, 35, 38, 41, 43, 47, 49 (7).

Чорныя простыя шашкі: 8, 11, 19, 27, 32, 37 (6).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Міжнародны гросмайстар Яўген Кандрачэнка (Гомель) стаў пераможцам традыцыйнага турніру па шашках-64 «Белыя ночы — 2018», які адбыўся ў апошні тыдзень ліпеня ў Санкт-Пецярбургу.

Міжнародная федэрацыя шашак (IDF) з 30 ліпеня па 7 жніўня 2018 года ў Курэмаа, вобласць Йыгева (Эстонія), праводзіць 4-ы этап Кубка свету 2018 года па шашках-64 — Міжнародныя спаборніцтвы «Йыгева-2018». Спаборніцтвы праводзяцца па трох праграмах: класічнай, хуткай і маланкавай. У першы дзень мерапрыемства перамогу ў хуткай праграме святкаваў міжнародны гросмайстар Андрэй Валюк (Мінск). Калі пісаліся гэтыя радкі, Андрэй у асноўнай праграме ішоў на другім месцы за два туры да фінішу, адстаючы ад лідара ўсяго на 1 ачко.

Праверце свае рашэнні: выпуск № 68 ад 27.07.2018.

№ 49 f4(e3A), d8, d2 x A(g3), h2(e3, f2B), g3, e5 x B(d2), c3, e5 x.

№ 50 g5(f4), g5, g3, b8(e3, e5, c7), e7, a7(e5), e3(d6), h6(d4), f8(e5), g7 x.

№ 51 1(40), 15, 32, 43 x.

Правільныя адказы даслалі В. Дударэвіч (в. Новая Мыш, Баранавіцкі р-н), Ф. Карпей (Мядзел), В. Статкевіч (п. Зялены Бор, Івацэвіцкі р-н), В. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі, А. Ліцьвінаў (усе Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі р-н), В. Бандарык (Мінскі р-н).

**Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, г. Мінск, 220013; e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**


РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«КЛИК УДАЧИ»

**Сведения об организаторе.**

Общество с ограниченной ответственностью «360 медиа групп» (далее именуемое – «Организатор»), адрес: 223054, Минская обл., Минский р-н, аг. Острошицкий Городок, ул. Ленина 1-3, каб. 3-1-21. Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета № 0046451 от 11 апреля 2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690318126, свидетельство о государственной регистрации выдано 24 апреля 2008 г.

**Наименование Рекламной игры.**

Рекламная игра носит название «Клик удачи».

**Сроки проведения Рекламной игры:**

Рекламная игра проводится с 10 мая 2018 года по 10 августа 2018 года (включая период розыгрышей, вручения призов и публикацию результатов проведения рекламной игры).

**Сведения о государственной регистрации Рекламной игры.**

Свидетельство о регистрации Рекламной игры № 3271 от 7 мая 2018 года выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

**Количество участников Рекламной игры.**

Всего к участию в игре было допущено 16 160 участников полностью соответствующих требованиям Правил Рекламной игры.

**Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда.**

Призовой фонд Рекламной игры в размере 174 951,11 (сто семьдесят четыре тысячи девятьсот пятьдесят один рубль) одиннадцать копеек разыгран полностью.

**Всего 161 победитель по результатам двух розыгрышей – от 13 июня 2018 года (первый розыгрыш) и от 13 июля 2018 года (второй розыгрыш):**

**100 победителей – приз** – чемодан AMER. TOURISTER JOYRIDE 36G*01 001 и денежный приз для уплаты подоходного налога 5,56 BYN.

**50 победителей – приз** – подарочный сертификат на приобретение велосипедов номинальной стоимостью 600 BYN от ЧТУП «ВАПО-Трэйд» и денежный приз для уплаты подоходного налога 71,43 BYN.

**10 победителей – приз** – подарочный сертификат на туристические услуги номинальной стоимостью 4000 BYN от ООО «Первая туристическая компания» и денежный приз для уплаты подоходного налога 579,47 BYN.

*полную информацию о победителях смотрите на сайте организатора www.360.by

**1 победитель – приз** – легковой автомобиль BMW 320i (F30) Седан, г.в. 2017 VIN: X4X8A394405J91726 и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 10267,91 BYN: Марковский Олег Иванович.

В соответствии с пунктом 11.8 правил Рекламной игры «Клик удачи» – при получении призов Победители несут все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводится в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь и осуществляется Организатором Рекламной игры. Удержание с победителей Рекламной игры подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) в момент выдачи приза из денежной части приза – денежная часть приза удерживается Организатором для уплаты подоходного налога в установленном размере.

**Сведения о наименовании и дате выхода печатного средства массовой информации, в котором опубликованы правила проведения Рекламной игры и сведения о результатах проведения рекламной игры.**

Публикация правил рекламной игры – газета «Звязда», № 87, дата 10.05.2018 г.

Публикация сведений о результатах проведения рекламной игры – № 152 дата 10.08.2018 г.

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: +375 17 239 07 70


# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## Сядзі і глядзі

# НАЗВАЦЬ ПАЙМЕННА



**«Памылка інжынера Кочына», «Беларусь 3», 15 жніўня**

Інжынер-канструктар авіязавода Кочын бярэ дадому чарцяжы самалёта, каб унесці ў іх папраўкі паводле вынікаў лётных выпрабаванняў. Аднак яго начальнік, які супрацоўнічае з разведкай замежнай дзяржавы, паведамляе аб гэтым агенту разведкі, і той з дапамогай закаханай у Кочына суседкі пранікае ў кватэру ды фатаграфуе сакрэтныя чарцяжы. А далей у справу ўключаецца пільны шавец і супрацоўнікі органаў дзяржбяспекі, і, значыць, шпіёны і шкоднікі абавязкова будуць выкрытыя.

**«Капітан Фантастык», TV1000, 15 жніўня**



Бэн Кэш з жонкай Лэслі і шасцю дзецьмі жыве далёка ад цывілізацыі ў лесе, прынцыпова выхоўвае дзяцей сам і вучыць іх навыкам выжывання, замежным мовам і навукам, сярод якіх і філасофія, і квантавая фізіка. Знянцца з месца сям'ю прымушае трагедыя: іх маці і жонка, шпіталізаваная з біпалярным расстройствам, скончыла жыццё самагубствам... Фільм, зрэшты, не ўганяе ў нудоту, а з усмешкай расказвае пра складаныя рэчы, у тым ліку выбар паміж жыццём хіпі і сучасным грамадствам з яго жорсткімі рамкамі, гаджэтамі ды сацыяльнымі сеткамі.



**«Вераніка не хоча паміраць», «Беларусь 1», 17 і 19 жніўня**

Паспяховая бізнес-ледзі Вераніка даведваецца пра здраду мужа і збіраецца падаць на развод, а каб падманшчык не змог прэтэндаваць на долю ў бізнесе, з дапамогай свайго сябра Арцёма пераводзіць усе актывы на іншую фірму. Праз некалькі дзён у аўтамабіль жанчыны ўразаецца грузавік, і тая цудам застаецца жывой. Аднак у шпіталі невядомы робіць новы замах, і Вераніка збягае. Яна падазрае мужа, аднак пасля яго трагічнай гібелі галоўным падазраваным робіцца сябар Арцём...

**«Акадэмія пана Кляксы», TV1000 Kino RU, 17 і 18 жніўня**



Ціхі хлопчык Адам Нескладушка, заўзяты фантазёр і летуценнік, раптам трапляе ў казачны свет. Дакладней, у казачную акадэмію пана Кляксы, куды прымаюць толькі дзяцей, і толькі тых, чые імёны пачынаюцца на літару «А». Займаюцца яны па дзіўных прадметах, сярод якіх мова раслін і жывёл і «кляксапісанне», а яшчэ вучацца бачыць цікавыя сны і рабіць добрыя справы. Хіба не з гэтага пачынаецца сапраўднае чараўніцтва?



**«Афоня», ТВ3, 18 жніўня**

Слесар-сантэхнік Афанасій, нібы жывы прыклад з анекдотаў, жыў сабе бестурботна: працаваў без імпэту, але з «наварам», любіў пры выпадку выпіць і заляцацца да дзяўчат. Але стаў героем трагікамедыі Георгія Данелія, і адразу ўсё неяк ускладнілася. Аказалася, што жыццё без мэты — шэрае і бессэнсоўнае, а шчасце можа хадзіць зусім побач, і толькі ад цябе залежыць, ці пазнаеш ты яго...

## Запрашальнік

# Квасны настрой створаць у Навагрудку

**Усіх запрашаюць на свята «Хлеб, сыр, квас і добры настрой», якое адбудзецца ў райцэнтры 25 жніўня.**

Мерапрыемства пройдзе на галоўнай плошчы горада — Леніна. Апоўдні акрамя канцэртнай праграмы ўсе прысутныя змогуць пачаставацца смакатой падчас прома-акцый ад мясцовых прадпрыемстваў на пляцоўках «Вясёлы мельнік», «Сырная даліна», «Квас для Вас».

На працягу дня будуць працаваць «Рамесніцкі праспект», падворкі прадпрыемстваў перапрацоўчай прамысловасці, выстаўкі-дэгустацыі, майстар-класы, сваю прадукцыю прапануе Свята-Елісееўскі Лаўрышаўскі мужчынскі манастыр.

Завершыцца свята канцэртам гурта Singing ROCK і вулічнай дыскатэкай.

# Мелодыі прыгранічча

**Прадстаўніцтва Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва «Польшча — Беларусь — Украіна» — установа «Брэсцкі трансгранічны інфацэнтр» запланавала правядзенне на тэрыторыі Беларусі мерапрыемстваў пад назвай «Мелодыі прыгранічча».**

Сярод іх канцэрт сучаснай музыкі, які 11 жніўня пройдзе ў амфітэатры парку культуры і адпачынку Маладзечна. У ім прымуць удзел Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры» і рок-група «J:МОРС». Уваход на канцэрт свабодны.

Сёлета спаўняецца пятнаццаць гадоў з дня рэалізацыі Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва. Праграма ратыфікавана Законам Рэспублікі Беларусь ад 17 кастрычніка 2017 года і дзейнічае ў Брэсцкай, Гродзенскай, Мінскай і Гомельскай абласцях. У яе межах ажыццяўляецца шэраг праектаў, накіраваных на развіццё прыгранічных тэрыторый Беларусі, Польшчы і Украіны

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.40** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10** Зона Х. (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20, 12.10, 18.45, 19.20 Серыял «Шлюб па завяшчанні. Танцы на вуглях». (16+).**
**12.40, 13.05, 14.35, 15.25 Серыял «Падары мне жыццё». (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**18.15** Лёс гігантаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж. (12+).
**22.10 Серыял «След». (16+).**
**0.20** Арэна.
**1.00** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца. (12+).
**9.00, 18.35, 22.10** Тэлебарометр.
**9.30, 20.00 Серыял «Зразумець. Дараваць». (16+).**
**10.40** Капейка ў капейку. (12+).
**11.15** Камень, нажніцы, папера. (16+).
**11.45** «Спатканне для мамы». (12+).
**12.45** «Свет навыварат. Японія». (16+).
**13.40** М/с «Качыныя гісторыі». (0+).
**14.30** Анімацыйны фільм «Смурфікі-2». (0+).
**16.15 Фэнтэзі «Хронікі Нарніі: Леў Вядзьмарка і Чароўная шафа». (12+).**
**19.15** Суперлато.
**21.00** «Паненка-сялянка». (16+).
**22.00** КЕНО.
**22.15 Серыял «Аўташкола». (12+).**
**23.10** Ідзі сюды і танцуй.
**23.15** Сыграй мяне, калі зможаш. (12+).
**23.50** «Арол і рэшка. Юбілейны». (16+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня». Рыбны суп са шчаўем.
**8.05, 12.00, 19.55** Навіны культуры.
**8.20, 12.15** Гэты дзень.
**8.30** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.25, 17.50** «Апошні дзень». Аркадзь Райкін (12+).
**10.00** «Навукаманія» (6+).
**10.30 «Рэстаран пана Сепціма». Камедыя (12+).**
**12.50** «Наперад у мінулае».
**13.15, 21.05** «Цені знікаюць апоўдні». Маст. фільм «Рачныя зоркі» (12+).
**14.25, 22.10** «Вызваленне». «Усходне-Памеранская наступальная аперацыя» (12+).
**14.50 «Маё каханне». Меладрама (12+).**
**16.10** «Славянскі базар у Віцебску-2018».
**18.25 «Сын старшыні». Маст. фільм (12+).**
**20.10** «Тэатр у дэталях». Брадвейскі рок-мюзікл «Недалёка ад нормы». Тэатр «Тэрыторыя мюзікла».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.35** «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара, народнага артыста БССР Анатоля Багатырова.

### Беларусь 5

**6.55** Футбол. Міжнародны Кубак чэмпіёнаў. «Атлетыка Мадрыд» (Іспанія) — «Інтэр» (Італія).
**8.55** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы.
**11.35** Піт-стоп.
**12.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Вэст Хэм».
**14.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Саўтгэмптан» — «Бернлі».
**16.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**17.05** Час футбола.
**17.50** Спорт-цэнтр.
**18.00** Тэніс. WTA. Цынцынаці.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** «Нашы навіны».
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** «Контуры».
**10.00** «Жыць здорава!» (12+).
**11.10** «Кантрольная закупка» (12+).
**11.50** «Модны прыгавор» (12+).
**13.10 Серыял «Блізняты» (12+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+).
**16.20, 0.05** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.30, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** «Час».
**21.10 Серыял «Каханне па загадзе» (16+).**
**23.05 Серыял «Чырвоныя бранзалеты» (12+).**
**1.00** «Начныя навіны».

### СТБ

**5.30** «Вялікі горад».
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**6.10, 20.15** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 19.55, 23.00** «СТБ-спорт».
**9.05** «Скардзіцца дазваляецца».
**9.25** «Тыдзень».
**10.40, 20.25 «Водбліскі». Серыял (16+).**
**12.20** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.40, 23.25** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45** «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
**14.35, 22.10** «Глядзець усім!» (16+).
**15.00** «Ежа багоў» (16+).
**15.55, 16.50 «NEXT-3». Серыял (16+).**
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.05** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**0.35** «Мінтранс» (16+).
**1.25** Дакументальны праект (16+).

### МІР

**6.00 Серыял «АСА» (16+).**
**7.35, 8.05, 10.05, 13.15 Серыял «Агент нацыянальнай бяспекі-2». (16+).**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**14.00, 3.40** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.00, 4.40** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 2.45** «Гульня ў кіно» (12+).
**17.05 Серыял «Вяртанне Мухтара-2». (16+).**
**19.20 Серыял «Агент». (16+).**
**22.55, 0.10 Маст. фільм «Аднакласніцы» (12+).**
**1.05 Маст. фільм «Блізняты» (0+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40 Маст. фільм «Заезджы маладзец».**
**13.25** Пакой смеху.
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу .
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**20.40 Серыял «Спакушэнне». (12+).**
**23.10 Серыял «Касатка». (12+).**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**7.10, 8.10, 10.30 Дэтэктыў «Сеткавая пагроза». (16+).**
**12.00** «Чакай мяне». (12+).
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Мянтоўскія войны». (16+).**
**17.05** «ДНК». (16+).
**18.10, 19.45 Серыял «Марскія д'яблы». (16+).**
**21.25 Серыял «Ляснік. Свая зямля». (16+).**
**23.15** «НЗ.by».
**23.40 Серыял «Сведкі». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.45, 21.00, 0.05** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.15, 23.10 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**8.10 Серыял «Цяжкі пясок» (16+).**
**9.10, 19.50 Серыял «Кандзіс Рэнуар».**
**10.10** Здароўе.
**11.00, 18.15 Серыял «Сакратар» (16+).**
**12.30 Меладрама «Французскі пацалунак» (16+).**
**14.25 «Героі коміксаў на экране». Фантастыка «Патруль часу».**
**16.00** «Мультпарад» (0+).
**16.10** Дак. фільм «Маля» (0+).
**16.55** Белтайрторг прадстаўляе... «Нортэк».
**17.10 Серыял «Турэцкая для пачаткоўцаў» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05 Драма «Злачынны намер» (16+).**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер» (16+).
**7.00** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**7.40, 0.00** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**9.00, 3.00** М/ф «Чычы Лэнд». (0+)
**9.30, 3.20** М/ф «Марын і яго сябры». (0+)
**9.55, 3.45** М/ф «Маша і Мядзведзь». (0+)
**10.20, 19.20** «Уральскія пельмені». (16+).
**11.30** «Проста кухня» (16+).
**12.00** «Паспець за 24 гадзіны» (16+).
**13.00** Серыял «Беглыя сваякі» (16+).
**15.10** Баявік «Прыстанак зла-5: адплата». (16+).
**17.10** Анімацыйны фільм «Ранга». (6+).



**21.00** Серыял «Новы чалавек» (16+).
**23.00** Серыял «Гальгін.ru» (16+).
**2.10** «Вакол свету падчас дэкрэту» (12+).
**2.40** «Ералаш» (6+).
**4.00** «Лаві момант» (16+).
**5.00** «Дурні і дарогі» (16+).

### Культура

**6.30** «Лета Гасподняе». Пераўтварэнне.
**7.05** «Не аддавай каралеву». Маст. фільм.
**9.30** М/ф «У лясным гушчары». «Сцёпа-марак». «Ну, пачакай!»
**10.30** «Звычайны канцэрт».
**10.55** «Шумны дзень». Маст. фільм.
**12.30** Невядомая Еўропа. «Парыж — горад закаханых, або Дабраславенне Марыі Магдаліны».
**13.00** «Навуковы стэнд-ап».
**13.55, 2.05** «Некранутая прырода Калумбіі». Дак. фільм.
**14.45** «Танец на экране». Дак. фільм.
**15.45** Легендарныя ролі Чарльза Лоўтана. «Капітан Кід». Маст. фільм.
**17.20** «Пешшу...» Масква чырвоная.
**17.45** Па слядах тайны. «Што было да Вялікага выбуху?»
**18.35** «Рамантыка рамансу». Гала-канцэрт.
**21.00** «Манон з крыніцы». Маст. фільм.
**22.50** «Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра». Опера «Паданне пра нябачны горад Кіцеж і дзеву Феўронню». (18+).

### Настальгія

**6.10** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1968. 1-я частка. (12+).
**7.25, 8.40, 9.45, 11.00, 12.50, 19.25, 23.35, 0.40, 2.40, 3.45** Музычная настальгія (12+).
**7.40** «Майстры мастацтваў». Яўген Лявонаў. 1986 год (12+).
**9.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00** «Колба часу» (16+).
**12.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР». (12+).
**13.00** «Гутарка з Прэзідэнтам СССР». 1991 год (12+).
**13.40** «Бізнес і палітыка». 1992 год (12+).
**14.40** «Сустрэча з Салжаніцыным». 1994 год (12+).
**15.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**16.00** Маст. фільм «Печнікі». (16+).
**17.25** «СММ». 1990 год (12+).
**18.00** «Вакол смеху». 1979 год (12+).
**19.40** «Веселые рэбята». «Моладзь і музыка». 1986 год (12+).
**21.00** Маст. фільм «Гарадскія падрабязнасці» («Каханне з прывілеямі»). (16+).
**0.00** «Ялавая субмарына». Наталля Вятліцкая. 2005 год (12+).
**1.00** Маст. фільм «Вось такая гісторыя...» (16+).
**5.00** «Песня-83». 2-я частка (12+).

### EuroSport 1

**4.00** Снукер. World Open. Фінал.
**6.00, 9.30, 15.00, 20.15, 2.30** Веласпорт. «Бінк-Банк Тур».
**7.00, 11.00, 14.00, 18.00, 0.00** Веласпорт. «Арктычная гонка Нарвегіі».
**8.00, 12.00, 1.00** Футбол. Кубак свету U-20.
**19.15** Аўтагонкі. World Endurance.
**21.00** Веласпорт. «Класіка. Гамбург».
**22.00** Веласпорт. «Класіка. Калярада».

### Кінакамедыя

**0.45** Маё вялікае грэчаскае лета. (16+).
**2.45** (Не)чаканы прынц. (16+).
**4.35** Вампіршы. (16+).
**6.15** Дзікая штучка. (16+).
**8.10** Высокая мода. (16+).
**10.40** Высокі бландын у чорным чаравіку. (12+).
**12.25** Вяртанне высокага бландына. (12+).
**14.10** Усё пра мужчын. (16+).
**15.40** Нягледзячы ні на што. (16+).
**17.50** Вялікае вяселле. (16+).
**19.30** Загадай жаданне. (12+).
**21.05** Каханне прэт-а-портэ. (12+).
**22.45** Забойны агеньчык. (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**10.00** «Паненка і хуліган» (12+).
**10.35, 1.15** «Дзявочнік». Серыял (16+).
**14.25** «Жонка. Гісторыя кахання» (16+).
**15.45** «Разлучнікі і разлучніцы. Як зводзілі каханых». Дак. фільм (12+).
**16.35** «Хроніка гнюсных часоў». Серыял (12+).
**20.00** «Без падману» (16+).
**20.55** «Чалавек у жалезнай масцы». Маст. фільм (12+).



**23.15** «Асцярожна, махляры!» (16+).
**23.45** «Грань». Серыял (16+).
**4.40** «Знайсці згубленага». Дак. фільм (16+).

### ТБ1000

**6.10** Мільянер з трушчоб (12+).
**8.40** Джулі і Джулія: рыхтуем шчасце па рэцэпце (16+).
**11.10** Успомніць усё (16+).
**13.35** Mamma mia! (16+).
**15.55** Якія не спяць у Сіэтле (0+).
**18.05** Хлапечнік у Вегасе (16+).
**20.10** Код да Вінчы (16+).
**23.10** Адступнікі (16+).
**2.10** Мабільнік (18+).
**3.50** Пераправа (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Каханне ў вялікім горадзе-2 (16+).
**8.15** Чорная вада (16+).
**10.25** Добры хлопчык (12+).
**12.20** Крымінальны квартэт (12+).
**14.10** За гранню рэальнасці (12+).
**16.20** Дзень выбараў-2 (12+).
**18.30** Бяжы! 1-я серыя (16+).
**20.20** Каханне ў вялікім горадзе-3 (12+).
**22.00** Экіпаж (6+).
**0.40** Ваўкалакі (16+).
**2.20** No Comment (16+).
**4.20** Крыніца (12+).

### National Geographic

**6.00** Аўта-SOS. Сезон (12+).
**6.45** Зона будаўніцтва. (12+).
**7.15, 5.15** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**8.05, 10.20** Неверагодны доктар Пол. (16+).
**8.50, 12.40** Золата Юкана. 12+).
**9.35** Дзікі тунец-7. (12+).
**11.50, 21.10, 0.20** Інстынкт выжывання. (16+).
**13.25, 19.35, 2.05** Сапраўдны геній. (12+).
**14.55** Сакрэтныя матэрыялы Юрскага перыяду. (16+).
**15.40** Пачатак. (16+).
**17.15** Больш, чым тыраназаўр. (12+).
**18.00, 22.00, 1.05** Асушыць акіян. (16+).
**18.50, 22.45** Другая сусветная вайна: пекла пад вадой. (16+).
**20.20** Сіла племені. (16+).
**23.35** Дзіўная Другая сусветная. (16+).
**3.35** Цуды інжынерыі. (12+).
**4.25** Вядомы Сусвет. (12+).

### Discovery

**8.00, 10.30** Як гэта ўстроена? (12+).
**11.00, 2.00** Ратавальнікі-цяжкавагавікі. (16+).
**12.00, 1.00** Скарб Купера. (12+).
**13.00** Голыя і напалоханыя. (16+).
**14.00** Узрываючы гісторыю. (12+).
**15.00** Мяцежны гараж. (12+).
**16.00** Металаломшчыкі. (16+).
**17.00, 19.30** Ліквідатар. (16+).
**20.00** Махінатары. (12+).
**23.00** На краі зямлі. (12+).
**0.00, 7.10** Вулічныя гонкі. (16+).
**2.55** Бітвы робатаў. (12+).
**3.50** Хакер у дзікай прыродзе. (16+).
**4.40** Гаражны рамонт. (12+).

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*

## Беларусь 1

**6.55** Ісенасць.
**7.25, 21.45 Меладрама «Яго каханне». (12+).**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.15** «Усё як мае быць».
**9.45** Здароўе. (12+).
**10.40** Кулінарная дыпламатыя. (12+).
**11.20** Дача. (12+).
**12.10** «50 рэцэптаў першага». (12+).
**12.50, 15.45 Меладрама «Усмешка ліса». (16+).**
**15.15** Краіна.
**17.30 Меладрама «Ілжэсведка». (16+).**
**21.00** Панарама.
**0.50** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**7.00** М/с «Усё пра Розі». (0+).
**7.30 Фільм для дзяцей «Шацёра вандруюць па свеце». (12+).**
**8.40, 21.55** Тэлебарометр.
**8.45** Камень, нажніцы, папера. (16+).
**9.15** «Спатканне з будучыняй». (16+).
**10.10** «ЖаннаДапамажы». (16+).
**11.10** Анімацыйны фільм «Прыгоды імператара». (0+).
**12.25** «Паненка-сялянка. Міжкантынентальны сезон». (16+).
**13.25 Камедыя «Малы». (12+).**
**15.10** Капейка ў капейку. (12+).
**15.45** «Вяселле ўслепую». (16+).
**17.20 Камедыя «Лысы нянька: спецзаданне». (12+).**
**18.55 Фэнтэзі «Хронікі Нарніі: прынц Каспіян». (12+).**
**21.20** Сыграй мяне, калі зможаш. (12+).
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**22.05 Фантастыка «Дывергент-3: за сцяной». (12+).**
**0.05** «Арол і рэшка. Юбілейны». (16+).

## Беларусь 3

**7.35** «Сіла веры».
**8.00, 12.20, 20.15** Навіны культуры.
**8.15, 12.35, 20.30** Гэты дзень.
**8.20** М/ф (0+).
**8.35 «Цыган». Маст. фільм (12+).**
**10.00** «Жывая культура». Традыцыя пакланення каменным крыжам «Каменныя дзевачкі». Вёска Данілевічы, аграгарадок Баравое (Лельчыцкі раён Гомельскай вобласці).
**10.25** «Беларуская кухня». Маэзха.
**10.55 «Вячэра з прыдуркам». Камедыя (12+).**
**12.40** «Навукаманія» (6+).
**13.10** «Люблю і памятаю». Народны артыст СССР Мікалай Яроменка.
**13.55 «Сын за бацьку...» Драма (16+).**
**15.20** «Я хачу гэта ўбачыць!» Нарач (6+).
**15.45** «Усё толькі пачынаецца». Канцэрт.
**17.05 «Аперацыя «Гаргона». Маст. фільм (16+).**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Экіпаж». Драма (12+).**
**23.20** «Вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў». Опера «Сельскі гонар».

## Беларусь 5

**6.55** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Днепр» (Магілёў) — «Нёман» (Гродна).
**8.50, 23.10** Тэніс. WTA. Цынцынаці.
**10.00, 12.30, 15.00, 18.00** Мастацкая гімнастыка. Чэлендж-кап. Мінск.
**12.00** Легенды сусветнага спорту.
**14.30** Гульні «навырост».
**16.00** Лёгкая атлетыка. Брыльянтавая ліга. Бірмінгем.
**19.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Чэлсі» — «Арсенал».
**21.30** Дзюдо. Еўрапейскі турнір. Мінск.
**23.00** Спорт-цэнтр.

## АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі) «Нашы навіны».
**7.10** «Іграй, гармонь любімая!» (6+).
**8.00** «Мікалай Дабрынін. «Я — эталон мужа» (12+).
**9.10** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды» (0+).
**9.30** «Тэорыя змовы» (16+).
**10.20** «На наш густ» (12+).
**11.05** «Ідэальны рамонт» (12+).
**12.10 Меладрама «Ракавая красуня» (16+).**
**14.00** «Стас Міхайлаў. Супраць правілаў».
**15.00, 16.20** Канцэрт Стаса Міхайлава.
**17.20** «Хто хоча стаць мільянерам?» (12+).
**18.50** «Сёння ўвечары» (16+).
**20.00** «Нашы навіны». Суботні выпуск.
**20.45** «Метэагід».
**21.05** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**21.10** «Сёння ўвечары» (16+).
**22.50** «КВЗ». Прэм'ер-ліга (16+).
**0.20** «Бачылі відэа?» (12+).

## СТБ

**6.40** «Анфас».
**6.55** «Ежа багоў» (16+).
**8.30** «Самая карысная праграма» (16+).
**9.10** «Мінтранс» (16+).
**10.00** «Мінск і мінчане».
**10.30** «Вялікі горад».
**11.00, 20.10, 1.00** Дакументальны праект (16+).
**12.35, 13.40, 16.40 «NEXT-3». Серыял (16+).**
**13.30, 16.30, 19.30** Навіны «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**21.50 «Навошта табе алібі?» Серыял (16+).**

## МІР

**6.00** «Як у рэстаране» (12+).
**6.30, 9.00** М/ф (0+).
**6.55 Маст. фільм «Папялушка» (0+).**
**8.30** «Вой, мамачкі!» (12+).
**9.30** «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
**10.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** Дак. фільм «Іду на Няву» (12+).
**11.10 Камедыя «На Дзерыбасаўскай добрае надвор'е, або На Брайтан-Біч зноў ідуць дажджы» (16+).**
**13.00, 16.15, 19.15 Серыял «Колер чаромхі». (16+).**
**4.05 Маст. фільм «Сэрцы чатырох» (12+).**

## РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху». (16+).
**7.25 Серыял «Лорд. Сабака-паліцэйскі». (12+).**
**10.40** «Па сакрэце ўсяму свету». (12+).
**11.00, 20.00** Весткі.
**11.20** «Жывыя гісторыі». (12+).
**12.10** «Пяцёра на аднаго». (12+).
**13.00** «Ізмайлаўскі парк». Вялікі гумарыстычны канцэрт. (16+).
**15.05 Маст. фільм «Усё не выпадкова».**
**16.30 Маст. фільм «У час бяды». (12+).**
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.45** «Прывітанне, Андрэй!» (12+).
**22.30 Маст. фільм «Цудоўныя стварэнні». (12+).**

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05** «Ты супер». (6+).
**8.00, 10.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.20** «НЗ.by».
**8.55** «Урачэбныя тайны плюс». (12+).
**9.25** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+).
**10.25** Галоўная дарога. (16+).
**11.10** «Ежа жывая і мёртвая». (12+).
**12.10** Кватэрнае пытанне. (0+).
**13.20** «Пара ў адпачынак». (16+).
**14.05 Дэтэктыў «Смяротны танец». (16+).**
**16.20** «Следства вялі...» (16+).
**17.10, 19.30 Дэтэктыў «Сабака». (16+).**
**21.20 Баявік «Бой з ценем». (16+).**
**23.35 Серыял «Сведкі». (16+).**
**0.30** «Таямнічая Расія» (16+).

## 8 канал

**9.00, 18.55, 21.10, 0.45** «Надвор'е».
**9.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**9.15** Для дзяцей «Адказвайка» (0+).
**9.20** «Даведнік па краінах і кантынентах» (0+).
**9.30 Серыял «Англійскае забойства» (12+).**
**11.10 Драма «Чорная архідэя» (16+).**
**13.15 Баявік «Закаханы рыцар» (12+).**
**15.10** «Глядзім усёй сям'ёй». М/ф «Джок» (0+).
**16.30** «Здароўе».
**17.10 Баявік «Меркурый у небяспецы» (16+).**
**19.00 Драма «Кандагар» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.00** «Фэшн is my прафэшн».
**21.15 Драма «Доктар Жывага» (16+).**

## ВТБ

**6.00, 13.00, 15.10** «Супермамачка» (16+).
**7.05, 16.15** Серыял «Вароніны». (12+).
**8.40, 4.15** М/ф «Чычы Лэнд». (0+)
**9.00, 4.30** М/ф «Марын і яго сябры». (0+)
**9.30, 4.55** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**9.50, 4.05** «Ералаш» (6+).
**10.20** Фантастыка «Дывергент» (6+).
**14.05, 1.50** Серыял «Маладзёжка» (12+).
**17.50** Серыял «Івановы — Івановы» (16+).
**20.00** Фантастыка «Дывергент-2: інсургент» (12+).
**22.20** «Уральскія пельмені». (16+).
**23.00** Серыял «Новы чалавек» (16+).
**0.00, 5.10** Серыял «Псіхалагіня». (16+).
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**3.35** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30** «Гісторыі ў фарфоры». Дак. серыял.
**7.05, 18.00, 0.00** «Усё пачалося ў Харбіне». Серыял.
**7.55** «Пешшу...» Крым антычны.
**8.25** Канікулы! «Глядзі весялей!» Маст. фільм.
**9.30, 20.55** «Тоўстыя».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.00** Навіны культуры.
**10.15** «Тэатральныя архіў». «Тэатр Кацярыны Вялікай».
**10.45, 21.25** «Следства вядуць знатакі». Маст. фільм.
**12.20, 0.45** «Архіўныя тайны». Дак. серыял.
**12.45** Класіка Галівуда. «Маклінток!» Маст. фільм. Частка 1-я.
**13.50** «Хлеб і голад». Дак. праект.
**14.30** «Сімон Шноль. Ад 0 да 80». Дак. серыял.
**15.10** «Эрмітаж».
**15.40, 19.45** «Акіяны Сонечнай сістэмы». Дак. фільм.
**16.35, 1.15** Берлінскі філарманічны аркестр. «Летняя ноч» у Вальдбюне.
**17.30** «Айчына і лёсы». Набокавы.
**18.45** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**20.40** «Добрай ночы, малыя!»
**23.20** «Вячаслаў Ус. Іваноў. «І Бог начуе паміж радкоў...» Дак. серыял.
**2.15** «Уладзімір Баравікоўскі. Дар адчувальнасці». Дак. фільм.

## Настальгія

**6.00** «Акулы пяра». Лада Дэнс. 1998 год (16+).
**6.45, 8.40, 15.45, 17.35, 20.05, 21.45, 1.25, 2.40, 5.20** Музычная настальгія (12+).
**7.10** «Вакол смеху». «Пра анекдот». 1990 год (12+).
**9.00** Маст. фільм «Зіма ў раі». (16+).
**12.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Віктар Цой». 2005 год (18+).
**12.55** Тэлеспектакль «Гісторыя кавалера Дэ Грые і Манон Леско». 1980 год (16+).
**14.30** «Ранішняя пошта». 1985 год (12+).
**15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**17.15** Фільм-канцэрт «...Жадаем шчасця вам». 1985 год (12+).
**18.00** Фільм-спектакль «Балалайкін і К». 1975 год (12+).
**20.30** «Ранішняя пошта». 1986 год (12+).
**23.00** Тэлеспектакль «Альманах сатыры і гумару». 1980 год (12+).
**0.00** Маст. фільм «Вясёлая маладзь». (12+).
**1.45** «Што? Дзе? Калі?» Сезон 1983—1984 гг. (12+).
**3.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**4.00** Маст. фільм «Былы тата, былы сын». (16+).

## EuroSport 1

**4.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы.
**5.30, 11.00, 20.00** Скачкі ў ваду. Чэмпіянат Еўропы.
**6.00, 9.30, 15.00, 22.30, 2.30** Веласпорт. «Бінк-Банк Тур».
**7.00, 13.00, 18.00, 23.30** Веласпорт (шаша). Чэмпіянат Еўропы.
**8.00** Снукер. World Open. Фінал.
**12.00, 1.30** Чэмпіянаты Еўропы.
**19.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**19.30** «Найлепшае з коннага спорту».
**20.30** Алімпійскія гульні. «Зала славы».
**21.30** Алімпійскія гульні. «Анатомія спорту».
**22.00** Алімпійскія гульні. «Жывыя легенды».
**0.30** Футбол. Чэмпіянат свету сярод дзяўчат (U-20).

## Кінакамедыя

**0.35** Дробныя махляры. (12+).
**2.25** Спакуснік-2. (16+).
**4.45, 23.10** Што вытвараюць мужчыны!-2 (18 +).
**6.20** Вампіршы. (16+).
**8.05** Высокая мода. (16+).
**10.35** Вячэра з прыдуркам. (12+).
**12.10** Маё вялікае грэчаскае лета. (16+).
**14.00** Забойны агеньчык. (16+).
**15.55** Вулкан страсцей. (12+).
**17.35** Я ніколі не буду тваёй. (16+).
**19.30** Скандынаўскі фарсаж. (16+).
**21.15** Скандынаўскі фарсаж. Гонкі на лёдзе. (16+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.25** «У выдатнай форме» (12+).
**7.55** «Доктар І...» (16+).
**8.25, 19.00, 1.55** «Матылькі». Серыял (16+).
**10.15, 3.40** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**11.55, 17.15** «Варажбітка» (12+).
**13.00, 16.15** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.00** «Адкрыта з Асканай Байрак» (16+).
**14.55** «Простыя складанасці» (12+).
**15.25** «Натуральны адбор» (12+).
**21.00** «Хроніка гнюсных часоў». Серыял (12+).
**22.00, 5.15** «Нераскрытыя тайны» (12+).
**22.55** «Вокладка» (16+).
**23.25** «Грань». Серыял (16+).
**0.15** «Перавозчык-3». Баявік (16+).

## ТБ1000

**6.10, 16.00** Ва ўцёках (16+).
**8.10** Сэрцаед (16+).
**10.20** Застанься са мной (16+).
**12.10** Агент пад прыкрыццём (12+).
**14.05** Планета 51 (12+).
**18.05** Дзённікі нянькі (16+).
**20.10** Як украсці хмарачос (12+).
**22.15** Іржа і костка (16+).
**0.35** Бацькі і дочкі (18 +).
**2.45** Таксі-4 (12+).
**4.15** Помні (Memento) (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Памяць восені (16+).
**8.25** Івановы (12+).
**10.25** Злодзей (16+).
**12.25** Канец імператара тайгі (12+).
**14.20** Хатабыч (16+).
**16.20, 4.20** Спяшайцеся кахаць (12+).
**18.10** Населены востраў (12+).
**20.20** За гранню рэальнасці (12+).
**22.30** Дзень выбараў (16+).
**0.55** Кампенсацыя (16+).
**2.45** Бабуля лёгкіх паводзін (16+).

## National Geographic

**6.00** Зона будаўніцтва. (12+).
**7.15, 17.55, 22.00, 1.05, 4.05, 5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**8.00, 13.25** Неверагодны доктар Пол. (16+).
**8.45, 17.10, 21.10, 2.35** Аўта-SOS. (12+).
**9.35** Кітайская мегабудніца (16+).
**10.20, 12.40, 14.55, 20.20** Інстынкт выжывання. (16+).
**11.55, 14.10, 1.50** Залатая Юкана. (12+).
**16.25** Сіла племені. (16+).
**18.45, 22.45** Смяротны бой дыназаўраў (12+).
**19.35, 0.15** Расследаванні авіякатастроф. (16+).
**23.30** Паранармальнае. (16+).
**4.50** Непаражальныя канструкцыі. (12+).

## Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары. (12+).
**9.00, 15.00, 23.00, 5.30** Бітвы за кантэйнеры. (12+).
**10.00, 16.00, 21.00** Як гэта зроблена? (12+).
**11.00, 20.00** Паляўнічыя на склады. (16+).
**12.00, 18.00** Маланкавыя катастрофы. (16+).
**13.00** Хакер у дзікай прыродзе. (16+).
**14.00, 0.00** На краі зямлі. (12+).
**19.00** Узрываючы гісторыю. (12+).
**1.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**2.00** Не спрабуйце паўтарыць. (16+).
**2.55** Загадкавыя знікненні. (16+).
**3.50** Вулічныя гонкі. (16+).
**6.20** Хуткія і гучныя. (12+).
**7.10** У пошуках скарбаў: змяніны востраў. (12+).

# ПРАЦЫ ХАПАЕ. А ЖАДАННЯ?

**З 48 раёнаў краіны, дзе сітуацыя на рынку працы ацэньваецца як напружаная, па стане на 1 ліпеня толькі ў адным адбылося пагаршэнне стану — у Сенненскім, што на Віцебшчыне.**

Чаму так адбылося, якую ініцыятыву праяўляе мясцовая ўлада, каб выправіць сітуацыю? Гэта высвятляў карэспандэнт «МС».

## Шукаюць швачку, пастуха і бухгалтара

Сітуацыя ў раёне тыповая для краіны: афіцыйная колькасць беспрацоўных меншая, чым колькасць вакансій. У чым тады праблема?

— З аднаго боку, людзі скардзяцца, што не могуць уладкавацца, а кіраўнікі — на недахоп нармальных прэтэндэнтаў на пасады, нярэдка з нядрэннымі заробкамі. Я, калі стаў старшынёй камісіі, стаў аналізаваць тэму, каб разабрацца ў сітуацыі. Канешне, і раней праводзілася работа, каб усе, хто хоча працаваць, мелі такую магчымасць. Райвыканкам трымаў пытанне на кантролі, працягвае гэта рабіць. І кірмашы вакансій праводзіліся і гэтак далей. Іншая справа — ці зацікаўленыя людзі працаваць? — разважае **старшыня раённага Савета дэпутатаў Міхаіл ВІЛЮГА.**

У раёне, паводле даных на пачатак жніўня, колькасць беспрацоўных, якія знаходзяцца на афіцыйным уліку, 70 чалавек, а вакансій — 103. Найбольш запатрабаваныя рабочыя прафесіі: швачка, трактарыст, электрагазазваршчык, жывёлавод, пастух, аператар машыннага даення, кіроўца. А сярод спецыялістаў у дэфіцыце бухгалтары, заатэхнікі, ветэрынарныя ўрачы, аграномы.

Міхаіл Вілюга напружанасць на рынку працы тлумачыць аб'ектыўнымі прычынамі. У прыватнасці, на стадыі банкруцтва дзве сельскагаспадарчыя арганізацыі. Іх было вырашана далучыць да больш моцнай — пад эгідай холдынга. Стараннымі работнікам прапанавалі такія ж пасады. Тыя, хто, мякка кажучы, не разумее, што такое дысцыпліна і спрачаюцца, не надта рады ў гаспадарцы з сучаснымі вытворчымі тэхналогіямі. І адпаведнымі працоўнымі патрабаваннямі.

## «Хіпі» па жыцці?

Плюс, як адзначыў суразмоўнік, ёсць такія грамадзяне, якіх можна аднесці да катэгорыі «перакаці-поле». Дарэчы, ёсць з іх і тыя, хто асабліва не залежыць ад спіртнога, проста логіка свая.

— Абыякавыя, і ім усё роўна па жыцці. Як правіла, у такіх сям'і няма. Напрыклад, здаровы мужык запэўнівае, што даглядае састарэлую маму, а сам жыве з яе пенсіі. Але і з такім трэба гутарыць, пераконваць у неабходнасці працаваць. Не стане маці, як потым на жыццё зарабляць? — прыводзіць прыклад суразмоўнік.

Такіх «хіпі» сталі запрашаць на пасяджэнні камісій. У прыватнасці, у адным з сельсаветаў пагутарылі з шасцю тутэйшымі мужчынамі. Узрост прыкладна ад 35 да 55 гадоў. І двое пагадзіліся працаваць: пастухом і на грамадскіх аплатных работах.

## З хімчысткі ва ўладальнікі

Былая беспрацоўная **Алена ЛАМНІКАВА** летась стала навaспечанай уладальніцай аграсядзібы. Яе «Купальніца» знаходзіцца ў вёсцы Мелехава, якая ад Віцебска прыкладна за сорак кіламетраў. У раёне ўсяго 17 сядзіб, наведвальнікам прапануюць 12 турыстычных маршрутаў.

Цікава, што жанчына раней працавала ў абласным цэнтры ў дзяржаўнай хімчыстцы. Раней тут знаходзілася яе дача. З часам зразумела, што хоча жыць у вёсцы, у прыродзе. Але ж чым заняцца? А менавіта аграрны турызм — вельмі перспектыўная справа. Да таго ж сёння вельмі спрыяльныя падаткі: трэба заплаціць усяго базавую велічыню на год.

Жанчына расказала, што атрымала бязвыплатную фінансавую дапамогу ў памеры прыкладна 1,5 тысячы долараў у эквіваленце. Каб яе атрымаць, афіцыйна стала на



Алена ЛАМНІКАВА з дачкой Лізаветай.

Члены камісіі ўпэўніліся ў правільнасці такога кірунку дзейнасці. Наватт тыя, хто і далей працягвае жыць «сваім жыццём», напэўна, задумаліся.

Калі беспрацоўныя хочуць стаць больш запатрабаванымі, іх перавучваюць.

Як адзначыў **начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама Аляксандр ПАЎЛОЎСКІ,** сёлета арганізавалі навучанне каля дваццаці грамадзян па такіх спецыяльнасцях, як трактарыст-машыніст, кухар, майстар па манікюры і педыкюры ды і іншых. Сацыяльным работнікам стаў чалавек з абмежаванымі магчымасцямі.

улік у службе занятасці, напісала бізнес-план. Першымі гасцямі былі знаёмыя сяброў, потым іх сябры. Адначасова ў сядзібе могуць спыніцца каля 15 чалавек. Гаспадыня імкнецца, каб адпачынак прыязджалі сем'і. Сярод пастаяльцаў аднойчы былі члены здымачнай групы серыяла з Расіі.

Усім, хто спыняецца, прыходзіцца даспадобы вялізны сад, тры сажалкі з вялікай колькасцю рыбы. Ды і зімой тут адпачываеш душой. Можна пакатацца на каньках ці на лыжах.

Тутэйшыя, паводле слоў гаспадыні, адносяцца да бізнесу спрыяльна. Многія з раддасцю ходзяць у грыбы, ягады, прадаюць яйкі.

У перспектыве гаспадыня хоча купіць кароўку, можа і не адну, каня, не выключае, што ў гаспадарцы з'явіцца іншая жыўнасць, напрыклад, экзатычны поні. Тады будзе наймаць на працу вяскоўцаў. Муж Ягор ужо сёння ледзь спраўляецца з мужчынскімі абавязкамі па гаспадарцы. Дарэчы, ён — індывідуальны прадпрымальнік. У Віцебску займаецца рамонтам, афарбоўкай аўто. Сужэнцы не выключаюць, што потым будзе развіваць гэты бізнес і ў глыбінцы...

Акрамя гаспадыні сядзібы, летась дапамаглі яшчэ двум заяўнікам. Адзін займаецца вырабам і рамонтам мэблі, другі спецыялізуецца на вырабе лодак, альтанак, дзіцячых пляцовак, верхняй канструкцыі калодзежаў.

Сёлета яшчэ двум беспрацоўным аказалі фінансавую падтрымку для пачатку іх справы: развядзення буйной рагатай скаціны і гандлю сувенірнай прадукцыяй.

## Хто хоча, той зарабляе

У райвыканкаме канстатуюць, што дзякуючы заканадаўчай падтрымцы для тых, хто ў бізнесе або хоча займацца сваёй справай, адчуваецца прагрэс.

Як паведаміў **намеснік старшыні райвыканкама Сяргей ГАЛЫНЧЫК,** у раёне працуе каля 230 суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу і больш за 210 ІП. Толькі за першае паўгоддзе створана дзевяць прадпрыемстваў (пры адпаведным заданні ў пяць). Сярод навічкоў фірма, якая спецыялізуецца на вырошчванні і рэалізацыі на экспарт насення. Яшчэ адна зарабляе на вытворчасці кармавых дабавак, дзве фірмы дзейнічаюць у сферы дрэваапрацоўкі.

Ужо не першы год паспяхова працуе фірма з удзелам сербскага капіталу. Яна таксама займаецца дрэваапрацоўкай. У прыватнасці, тут вырабляюць пелеты. Калі вытворчасць пашыраюць, набіраюць людзей на працу. Да таго ж заробкі на самых адказных участках працы неблагія. Словам, хочаш працаваць — працуй і зарабляй.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# «У дворнікі не пайду. Непрэстыжна!»

## Так кажуць некаторыя грамадзяне, якія не маюць кваліфікацыі

**Хто хоча працаваць, шукае магчымасці, хто не хоча — прычыну. Канешне, працсей ляжаць на канапе і марыць, што прыйдзе добры дзядзька, возьме за руку і ўладкуе на работу. Але для гэтага трэба і самому пастарацца. Напрыклад, звярнуцца ў камісію па садзейнічанні занятасці насельніцтва, якая існуе ў кожным рэгіёне.**

У Салігорскім раёне створана камісія. Пасяджэнні праходзяць двойчы ў месяц. Прычым прымаюць грамадзян у самім горадзе і паралельна — на раёне. Члены камісіі назапасілі ўжо пэўны вопыт, выбудавалі дакладную сістэму працаўладкавання розных катэгорый грамадзян.

— Найчасцей да нас звяртаюцца людзі сярэдняга ўзросту, тыя, каму каля сарака гадоў і крыху больш, — дзеліцца назіраннямі **старшыня раённага Савета дэпутатаў Ала КАЛЕЕВА,** якая ўзначальвае камісію. — Прыходзіла і некалькі маладых людзей. Напрыклад, адзін з хлопцаў хоча быць кухарам. Мы яго накіравалі ў раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва. Дамовіліся, што яму знойдуць часовую работу і накіруюць на курсы па гэтай спецыяльнасці.

Наогул, для моладзі праблем з працаўладкаваннем не існуе, лічыць Ала Васілеўна. Праўда, ёсць нюансы з маладымі людзьмі, што рана абзавяліся сем'ямі. У іх, як правіла, за плячамі толькі школьная адукацыя, прафесіі няма. Таму яны могуць разлічваць на працу, якая не патрабуе кваліфікацыі: прыбіральшчыка, палявода. Але заяўнікаў такая сітуацыя не задавальняе. Паколькі тут шмат не заробіш. Ды члены камісіі ўсё ж раяць ім падумаць. Маўляў, у першую чаргу варта зачапіцца, мець хоць невялікую капейку, а затым упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне накіруе іх на курсы, каб атрымалі прафесію і мелі дастойны заробак.

— Што датычыцца моладзі з вышэйшай адукацыяй, то пытанняў з працаўладкаваннем няма, — запэўнівае суразмоўніца. — Да нас у пошуках работы прыходзіла дзяўчына, якая ў свой час закончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Мы звязаліся з кіраўнікамі прадпрыемстваў, арганізацый і знайшлі ёй работу па спецыяльнасці. У раёне дастаткова вакансій — больш за тысячу. І няма таго чалавека, якому б мы не змаглі нешта падабраць. Галоўнае жаданне!

А вось да людзей, якія доўгі час злоўжывалі спіртным, або працягваюць піць, ёсць пэўныя пытанні. Гэтыя грамадзяне з-за сваёй шкоднай звычкі страцілі здароўе і не змогуць прайсці медагляд па шэрагу спецыяльнасцяў. Такім наведвальнікам цяжка падабраць кваліфікаваную работу. Але займацца некваліфікаванай некаторыя не жадаюць — непрэстыжна. Тым не менш члены камісіі імкнуцца знайсці і для іх месца, тэлефануючы на прадпрыемствы, у арганізацыі. Напрыклад, там патрэбны падсобныя рабочыя. Перш чым пасдаць туды патэнцыйнага работніка, абавязкова высвятляюць, чым канкрэтна ён будзе займацца, ці асіліць працоўныя абавязкі чалавек са слабым здароўем.

— Ёсць і грамадзяне, якія выконваюць нейкія работы па дамоўленасці з фізічнымі асобамі. У прыватнасці, да нас звярнулася жанчына, што шые дома. Ёй растлумачылі, што неабходна аформіць самазанятасць і працягваць займацца справай і надалей, але ўжо афіцыйна.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Больш падрабязна глядзіце ў інфаграфіцы

ДА ВЕДАМА




Дапамогу ў 15 БПМ могуць атрымаць пры арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці, дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму, рамесніцкай дзейнасці беспрацоўныя, якія жывуць у малых і сярэдніх гарадах з высокай напружанасцю на рынку працы. Іх спіс вызначаецца дзяржаўнымі і (ці) абласнымі праграмамі садзейнічання занятасці насельніцтва. Такім правам скарысталіся за 6 месяцаў бягучага года 179 беспрацоўных.

І нарэшце, на самы вялікі памер дапамогі — 20 БПМ — могуць разлічваць беспрацоўныя пры арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці, звязанай з укараненнем вынікаў навуковых даследаванняў і распрацовак. Гаворка ідзе аб аб'ектах права прамысловай маёмасці: вынаходкі, карысныя мадэлі, прамысловыя ўзоры, сарты раслін, тапалогіі інтэгральнай мікрасхемы.

# «ПАСТАРАЕШСЯ — І 1500 РУБЛЁЎ АТРЫМАЕШ»

## Як працуе камісія па садзейнічанні занятасці ў Клецкім раёне

**Падабраць вакансію, дапамагчы аформіць групу інваліднасці, адправіць на лячэнне ад алкагольнай залежнасці... Камісіі па садзейнічанні занятасці на месцах спрабуюць ахапіць куды больш задач, чым толькі працаўладкаванне. Якую работу прапануюць у рэгіёнах, ці рэальна ў вёсцы атрымліваць «па пяцьсот» і што перашкаджае забяспечыць вакансіямі ўсіх, мы паглядзелі на прыкладзе Клецкага раёна.**

### Звольненыя — на кантролі

Камісія збіраецца двойчы на месяц — кожны другі і чацвёрты чацвер. Адно пасяджэнне праходзіць у горадзе, другое — на вёсцы. Практыка апраўданая: тры чвэрці тых, хто звяртаецца, жывуць у сельскай мясцовасці.

Як выяўляюць незанятых грамадзян?

— На вёсцы старшыня сельсавета ведае практычна ўсіх. Нашы сельсаветы невялікія — паўтары-дзве тысячы чалавек. Таму тыя, хто не працуе, на віду. Плюс аддзел арганізацыйна-кадравай работы выканкама запытвае інфармацыю аб звольненых, празвоньвае тых, хто не ўладкаваўся на работу. Апавяшчаем пра пасяджэнне камісіі праз аб'яву ў газеце, у сацыяльных сетках. Яшчэ не было такога, каб не прыйшоў ніводзін чалавек. Сама меней — чатыры, — расказвае **старшыня Клецкага раённага Савета дэпутатаў Святлана ЧЭКУН,**



якая ўзначальвае камісію.

У яе склад уваходзяць таксама намеснік старшыні райвыканкама па сацыяльнай сферы, спецыялісты службы занятасці, аддзела адукацыі, РАУС, ЖКГ, намеснік галоўнага ўрача Клецкай цэнтральнай раённай бальніцы, старшыня раённага аб'яднання арганізацый прафсаюзаў, юрыст, прадстаўнік рэдакцыі. Прысутнічаюць і кіраўнікі арганізацый.

3 лютага прайшло 11 пасяджэнняў. Па дапамогу звярнуліся 84 чалавекі, 65 з якіх накіравалі на працаўладкаванне. 25 застаюцца на рабоце і сёння. Вакансіі падабралі розныя: кухар у дзіцячым садку, кладаўшчык у прытулку, рабочы ў сельгасарганізацыі, бухгалтар у райвыканкаме.

— Чаму людзі звяртаюцца ў камісію? Напэўна, разумеюць, што гэта больш аператыўна. Мы валодаем інфармацыяй, хто дзе звольнены. З апошніх сітуацый. Прыйшла маладая жанчына, у якой вось-вось заканчвалася дэкрэтны водпуск. Арганізацыя, у якой яна працавала, ліквідавана. Жанчына была інжынерам па ахове працы, паглядзела, што вакансій такіх няма, і куды выходзіць, не ведала. Тут жа члены камісіі маюць інфармацыю, што кіраўнік аднай гаспадаркі шукае кандыдатуру на падобную пасаду, там якраз пенсіянер плануе звальняцца, — прыводзіць прыклад дэпутат.

На пасяджэнні прыходзяць і людзі, якія не працуюць з-за праблем са здароўем (такіх было 13 %). Ім выдаюць накіраванне ў бальніцу на медагляд. Такім чынам чатыры жыхары раёна атрымалі групу інваліднасці, яшчэ двое пралячыліся і прыступілі да працы.

### Галоўная праблема — нізкая матывацыя

Ёсць і адваротны бок. 41,5 % з тых, што былі накіраваны камісіяй на працаўладкаванне, да наймальніка так і не дайшлі. А 9,2 % адмовіліся ад работы пасля наведвання арганізацыі.

— З агульнай колькасці грамадзян, што не звярнуліся да наймальнікаў, каля 70 % складаюць асобы, якія маюць судзімасць і вядуць асацыяльны лад жыцця, — адзначае Святлана Чэкун. — Гэта кажа аб нізкай матывацыі да працы дадзенай катэгорыі і з'яўляецца, на наш погляд, самай галоўнай праблемай у рэалізацыі Дэкрэта № 1. Тым не менш работа не спыняецца. Людзі, якія вядуць амаральны лад жыцця, знаходзяцца на пастаянным кантролі ў работнікаў РАУС, цэнтральнай раённай бальніцы. Толькі за 2018 год 63 чалавекі пралечаны ад алкагольнай залежнасці, 22 — накіраваны ў ЛПП, 29, што маюць судзімасць, — працаўладкаваны.

Некаторыя на пасяджэннях з парога заяўляюць: «А што вы ўвогуле ад мяне хочаце? Мне і так добра». Кагосьці заробак па вакансіях не задавальняе. Але хто працуе, можа годна атрымліваць, упэўнена дэпутат.

— Мы нядаўна сустракаліся з калектывам фермы філіяла «Клецкі» Слуцкага сыраробнага камбіната. Там сярэдні заробак у даярак — 800—900 рублёў. Працуюць два праз два. Гэта нармальныя грошы для сельскай мясцовасці. На механічным заводзе, дзе ствараюць новыя месцы, заробак залежыць ад выпрацоўкі. Пастараешся — і 1500 рублёў атрымаеш.

Пытаемся нарэшце цяжкіх жыццёвых сітуацый, з-за якіх людзі не могуць працаваць: з чым даводзіцца сутыкацца? Святлана Чэкун вылучае некалькі момантаў. Напрыклад, патрэбны штодзённы дагляд



хворых бацькоў. Не заўсёды можна аформіць гэты дагляд афіцыйна — толькі калі ў сваяка ёсць I група інваліднасці ці ён старэйшы за 80 гадоў. Яшчэ адна сітуацыя — калі чалавеку па стане здароўя паказана лёгкая праца, а знайсці такую не атрымліваецца. На прыём у службу занятасці якраз прыйшоў мужчына з такой праблемай. Яму 60, на пенсію толькі праз паўтара года. Уладкавацца па сваёй будаўнічай спецыяльнасці не можа: ногі хворыя. Пакуль пагадзіўся на часовую работу — перабіраць смецце. А потым паспрабуе вывучыцца на качагара, калі ў бальніцу не пакладуць.

— У цэлым Дэкрэт № 1 пашырыў пералік цяжкіх сітуацый. Улічылі і бацькоў, якія выхоўваюць дзяцей да сямі гадоў, і тых, у каго ёсць асабістая падсобная гаспадарка. Вядома, прадугледзець усе жыццёвыя сітуацыі немагчыма. Таму да кожнай падыходзім індывідуальна, — дзеліцца дэпутат.

### Ад жывёлавода да балетмайстра

На сёння ў Клецкім раёне 276 свабодных рабочых месцаў. Вакансіі розныя. «Вельмі запатрабаваны работнікі ў сельскай гаспадарцы: жывёлаводы, паляводы, аператары машыннага даення, ветэрынары, заатэхнікі, кіроўцы, механізатары. У прамысловасці неабходны слесары механазборачных работ, швачкі. Акрамя таго, не хапае старшага і сярэдняга медперсаналу. Ёсць вакансіі для культработнікаў, — пералічвае **начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама Ала МЯЛЮК.**



Трактарысту-машыністу ў адной з гаспадарак прапануюць 510 рублёў, галоўнаму інжынеру на іншым сельгаспрадпрыемстве — 970. Фельчару абяцаюць 370 рублёў, хірургу — 490. Шукаюць таксама харэографа на заробак у 305 рублёў і балетмайстра — на паўстаўкі, за 153 рублі ў месяц. «Наймальнікі пазначаюць мінімальны заробак — без прэмій і надбавак», — тлумачыць Ала Мялюк.

На ўліку ў службе занятасці стаіць 57 беспрацоўных. Атрымліваецца, на аднаго прыпадае пяць вакансій. Але пры гэтым існуе дысбаланс па кваліфікацыях. Так, цяжка знайсці работу спецыялістам эканамічнага профілю: вакансій бухгалтара няма, а ў даяркі чалавек з вышэйшай адукацыяй наўрад ці пойдзе.

— На жаль, тэндэнцыя такая, што тэрмін працягласці беспрацоўя павялічваецца. На ўлік становяцца тыя, у каго ў большасці выпадкаў вельмі нізкая матывацыя да працы. Думаюць: «Замацаваўся, не дармаед — значыць, прэтэнзій быць не павінна». У 46 % незанятых грамадзян толькі агульная сярэдняя ці базавая адукацыя. Практычна 32 % маюць доўгі перапынак у рабоце — год і больш. 30 % не могуць працаўладкавацца па стане здароўя.

З пачатку года 538 чалавек, ці 63 % тых, хто звярнуўся ў службу занятасці, атрымалі пастаянную работу. 15 % пайшлі на часовыя работы — грамадскія, сезонныя. Вось прыклад: падчас ацяпляльнага перыяду людзі працуюць качагарамі, а потым — рабочымі зялёнага будаўніцтва (іх бяруць сельвыканкамы, ЖКГ).

Тых, каму не ўдаецца падабраць вакансію, адпраўляюць на бясплатныя курсы. З пачатку года іх прайшло 26 мясцовых жыхароў. Хтосьці перакваліфікаваўся ў кухара, хтосьці — у будаўніка.

— Стараемся тут, у Клецку, навучыць, бо беспрацоўныя, як правіла, маюць свае сем'і, ім складана кудысьці паехаць, — каментуе начальнік упраўлення.

Прапануюць і варыянт самазанятасці. На старт сваёй справы выдзяляюць субсідыю — 11 бюджэтаў пражытковага мінімуму грамадзянам (гэта 2350 рублёў) і 15 (ці 3205 рублёў) — вяскоўцам. З пачатку года такой магчымасцю скарысталіся шэсць чалавек. У асноўным жыхары Клецкага раёна прапануюць цырульніцкія і будаўнічыя паслугі, манікюр, дыягностыку і рамонт аўтамабіляў. Апошнія гады папулярныя таксама бухгалтарскія паслугі: відаць, эканамісты, якія не могуць знайсці вакансію, вырашаюць ствараць яе для сябе самі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА,**
*г. Клецк.*

## Тут дапамогуць працаўладкавацца

**Увага! Кожны тыдзень у чацвер у 10.30 па адрасе вуліца Кастрычніцкая, 3 працуе камісія па працаўладкаванні незанятага насельніцтва.**

Такая аб'ява вісіць на сайце Слаўгарадскага райвыканкама ў рубрыцы «Вакансіі і працаўладкаванне». Падобныя ёсць на электронных рэсурсах кожнага з раёнаў. Магчыма, толькі крыху з іншымі фармулёўкамі і днямі прыёму. У Хоцімску, напрыклад, штодзённа працуе тэлефонная лінія па «пытаннях рэалізацыі актыўных мер садзейнічання занятасці насельніцтва». Словам, у вобласці робіцца ўсё для таго, каб чалавек, які хоча працаваць, не застаўся са сваёй праблемай сам-насам. Усяго па вобласці створана 23 камісіі, якія садзейнічаюць занятасці насельніцтва.

— Яны пачалі працаваць яшчэ летась, а сёлета ў рамках рэалізацыі Дэкрэта № 1 створаны пастаянна дзеючыя камісіі па каардынацыі гэтай работы, — паведаміла **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага аблвыканкама Вольга ХАДУСКІНА.** — У кожнай працуе па 15 і болей прадстаўнікоў зацікаўленых службаў — са сферы адукацыі, аховы здароўя, з праваахоўных органаў і гэтак далей.

Галоўная праблема на сёння — гэта людзі, якія вядуць асацыяльны лад жыцця і злоўжываюць спіртным. А вось такіх, хто не хоча працаваць, бо маленькая зарплата або работа не падабаецца, становіцца ўсё менш. У канцы чэрвеня старшыня аблвыканкама Уладзімір Даманеўскі зацвердзіў парадак узаемадзеяння структурных падраздзяленняў аблвыканкама, гар- і райвыканкамаў па фарміраванні і вядзенні базы даных працаздольных грамадзян, якія не занятыя ў эканоміцы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ЯК НАПОЎНІЦЬ МАТРЫЦУ?

## У Ашмянскім раёне колькасць не занятых у эканоміцы грамадзян складае амаль тысячу чалавек

**Зварот «МС» да гэтага раёна невыпадковы. Тэма фарміравання базы не занятых у эканоміцы была ўзнята падчас выязнога пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі сёлета ў чэрвені. Тады завяршыўся этап фарміравання камісій у рамках рэалізацыі Дэкрэта № 1 «Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва». Раёну былі дадзены пэўныя рэкамендацыі. У прыватнасці, самастойна складаць спіс тых, хто падпадае пад дзеянне дэкрэта і не чакаць шаблона па яго стварэнні ад Мінпрацы. Якія зрухі адбыліся за гэты час і на што накіравана дзейнасць пастаяннай камісіі зараз? Аб гэтым наш карэспандэнт даведалася падчас размовы са старшынёй Ашмянскага райсавета, старшынёй камісіі Мікалаем КВЯТКЕВІЧАМ.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.
Здымак носіць ілюстрацыйны характар.

### Вызначаны адказныя

Суразмоўнік адзначыў, што ў складзе камісіі 17 чалавек. Большасць з іх маюць вопыт работы ў гэтым кірунку. Сярод членаў камісіі — кіраўнікі ўпраўленняў і аддзелаў райвыканкама; падатковай, землеўпарадкавальнай службаў; ЖКГ; аддзела ўнутраных спраў; прадстаўнікі дэпутацкага корпуса і прафсаюзаў.

За два месяцы ўжо адбыліся чатыры пасяджэнні. Напачатку былі вызначаны адказныя асобы па адпаведных кірунках дзейнасці камісіі. Напрыклад, хтосьці будзе адказваць за спісы грамадзян, якія вядуць падсобную гаспадарку на сваіх зямельных участках. Яшчэ адзін член камісіі павінен забяспечыць перадачу ў Гродзенскі аблвыканкам ідэнтыфікацыйных нумароў жыхароў, якія гэтую прадукцыю вырошчваюць. Вызначаны адказны за спіс электронных дакладаў па працаздольных грамадзянах, не занятых у эканоміцы. Згодна з графікам, камісіі будуць збірацца кожную другую і чацвёртую сераду месяца. Зацверджаны і даты прыёму грамадзян. Адпаведная інфармацыя размешчана на сайце райвыканкама і ў раённай газеце.

### Ёсць першы зварот

У раёне перш-наперш вырашылі звярнуць увагу на тых, хто доўгі час не працуе і вядзе асацыяльны лад жыцця. Такіх прыкладна 180 чалавек.

— Гэтыя асобы нам вядомыя, — зазначыў Мікалай Квяткевіч. — Сярод іх тыя, хто стаіць на прафілактычным уліку, вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі, прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за п'янства, ёсць сямейныя скандалісты. Усе яны занесены ў базу даных райаддзела міліцыі. Гэтыя спісы ёсць у гарадскіх і сельскіх наглядных камісіях, якія таксама вядуць работу з парушальнікамі.

На разгляд пастаяннай камісіі ў рамках рэалізацыі Дэкрэта № 1 былі прадстаўлены матэрыялы па чатырох сельсаветах. Старшыні Каменналогскага, Муравааашмянкоўскага, Жупранскага і Барунскага сельскіх выканаўчых камітэтаў расказалі, што робіць мясцовая ўлада, каб гэтыя людзі ішлі працаваць. Разам з тым разлічваць на імгненны поспех у гэтай справе не даводзіцца, разважае Мікалай Квяткевіч. Падчас мінулай кампаніі па папярэджанні сацыяльнага ўтрымантва членаў рабочай групы зрабілі пакватэрны абыход 152 чалавек. Амаль палова з іх заявілі, што гатовыя працаваць. Але скарысталіся такой магчымасцю толькі восем.

Пакуль што ў камісію звярнуўся толькі адзін чалавек з заявай прызнаць яго занятым у эканоміцы. Ён прыклаў дакументы, згодна з якімі мужчына працуе ў Расійскай Федэрацыі. На камісіі яго зварот разгледжаны і задаволены.

### Пачалі фарміраваць базу даных

Да 1 верасня павінен быць сфарміраваны першапачатковы банк даных. У цяперашні час усе адпаведныя службы прыступілі да гэтай работы, зазначыў Мікалай Квяткевіч. Канчатковы спіс будзе складзены да 1 снежня. Камісія будзе працаваць з індывідуальным падыходам, улічваць і складаныя жыццёвыя ўмовы. Якія катэгорыі будуць падпадаць пад дзеянне дэкрэта, каго выключылі з гэтага спіса — усе гэтыя моманты замацаваны ўрадавым дакументам.

Тыя, хто трапіць у базу, будуць кампенсаваць некаторыя віды камунальных паслуг, напрыклад за гарачую ваду. Тыя, хто не мае такой паслугі, напрыклад вясковыя жыхары, могуць у такія спісы не трапіць. Разам з тым беспрацоўныя будуць у полі зроку спецыялістаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва. Бо пры адсутнасці неабходнага страхавога стажу (у 2018 годзе — 16,5 года) чалавек можа атрымаць толькі сацыяльную пенсію, і то праз 5 гадоў пасля наступлення ўстаноўленага пенсійнага ўзросту. Па гэтай прычыне ў раёне за два мінулыя гады 11 чалавек атрымалі адмову ў афармленні пенсій.

— Звесткі пра гэта, а таксама пра неабходнасць і магчымасці працаўладкавання ў арганізацыях раёна даводзім да людзей праз сістэму інфармацыйнай работы: публікацыі ў сродках масавай інфармацыі, падчас сустрэч у працоўных калектывах і па месцы жыхарства насельніцтва, справаздач дэпутатаў перад выбаршчыкамі, выездаў інфармацыйна-прапагандысцкіх груп, — паведаміў суразмоўнік.

### Вакансій хапае

Па папярэдніх даных, у раёне не занятымі ў эканоміцы без абумоўленага прававога статусу можна лічыць каля адной тысячы чалавек. Вядома, не ўсе яны трапяць у спісы па пакрыцці расходаў за камунальныя паслугі. Кожны выпадак будзе разглядацца ўсебакова.

— У раёне вядзецца работа па працаўладкаванні жыхароў, стварэнні новых рабочых месцаў, — канстатуе Мікалай Квяткевіч. — На 1 жніўня наймальнікі заявілі аб 500 вакансіях, што ў 2,5 раза больш, чым за адпаведны перыяд мінулага года. Такі ж рост і па рабочых прафесіях.

Разам з тым працэс паступова ідзе. З пачатку года працаўладкавана 90 % беспрацоўных. Іх у службу занятасці звярнулася больш за 400 чалавек. А ўсяго працаўладкавана 540. Многія перавучыліся і знайшлі сабе новае месца работы. Зараз на ўліку стаіць больш за 60 чалавек. У іх ёсць магчымасць уладкавацца як на прадпрыемствы сельскай гаспадаркі, так і прамысловасці. Напрыклад, сельгаспрадпрыемствы прапануюць каля 70 вакансій, амаль столькі ж месцаў у прамысловасці. Палова з іх — рабочыя прафесіі. Кваліфікаваныя кадры чакаюць у будаўніцтве, сферы абслугоўвання, адукацыі, аховы здароўя.

У раёне рэалізуецца некалькі інвестыцыйных праектаў, дзе таксама ствараюцца новыя рабочыя месцы. У іх ліку — аб'ект прыдарожнага сэрвісу на трасе Мінск — Ашмяны і гасцініца ў Ашмянах. У чэрвені ўведзены супермаркет, на чарзе адкрыццё яшчэ аднаго буйнога гандлёвага аб'екта і лагістычнага цэнтра каля пункта пропуску «Каменны Лог». Мяркуецца, што сёлета будзе створана каля 100 новых рабочых месцаў.

— Наша задача — дапамагчы з працаўладкаваннем і тым, хто мае намер пачаць сваю справу, даць магчымасць ім легалізавацца, выйсці з «ценявога» бізнесу, — зазначыў Мікалай Уладзіміравіч.

Спрыяе гэтаму і прававая база. Дзякуючы новым магчымасцям павялічылася колькасць індывідуальных прадпрымальнікаў. Значна прыбавілася і рамеснікаў: колькасць плацельшчыкаў падаткаў вырасла ў 2,5 раза. З'явіліся новыя аграсядзібы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

**❍ У ТЭМУ**

У Ашмянскім раёне 17 тысяч чалавек працаздольнага ўзросту. З іх 13 тысяч занятыя ў эканоміцы. З улікам працуючых пенсіянераў колькасць незанятых складае 5,5 тысяч чалавек. У гэты пералік уваходзяць інваліды, навучэнцы, маці ў водпуску па доглядзе дзіцяці, вайскоўцы. Яшчэ 500 чалавек вядуць падсобную гаспадарку. Адна тысяча грамадзян працуе за межамі раёна. У рэшце рэшт, колькасць незанятых у эканоміцы складае амаль тысячу чалавек. З гэтым кантынгентам і будзе працаваць камісія па садзейнічанні занятасці насельніцтва ў рамках рэалізацыі Дэкрэта № 1.

МЕРКАВАННЕ

# Якія рэформы мясцовага самакіравання патрэбныя ў Беларусі?

**Мясцовае самакіраванне, якое ў Беларусі прадстаўляюць мясцовыя дэпутаты і некалькі амаль невядомых шырока структур, — гэта першыя дзверы, куды павінны грукацца нашы грамадзяне, каб вырашыць базавыя праблемы: каб адбыўся рамонт дарог, з'явілася вулічнае асвятленне, была адрамантаваная дзіцячая пляцоўка. Але так не адбываецца, бо галіна неразвітая, дэпутаты маюць мала паўнамоцтваў, жыхары ідуць хутчэй у выканкамы і не заўсёды атрымліваюць ад чыноўнікаў дапамогу.**



Як дэпутат Палаты прадстаўнікоў я бачу выйсце ў тым, каб правесці рэформы на заканадаўчым узроўні і потым прымяніць на практыцы. Адна з важных іх адметнасцяў — магчымасць, якая дазволіць падтрымліваць ініцыятывы грамадзян за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў, так званых бюджэтаў грамадзянскага ўдзелу.

Чаму такія змены патрэбныя? Гэта дазволіць палепшыць якасць работы органаў мясцовага самакіравання, дасць магчымасць людзям удзельнічаць у прыняцці рашэнняў, скіраваных на рэалізацыю ініцыятыў на карысць тэрыторый, дзе яны пражываюць. Гэта сусветная практыка, якая актыўна выкарыстоўваецца краінамі Вышаградскай групы.

Хто зацікаўлены ў зменах? Па-першае, самі грамадзяне. Яны атрымаюць сродкі на рэалізацыю праектаў, пасля якой пачынаюць больш адказна ставіцца да сваёй тэрыторыі, успрымаюць яе як сваю, ганарацца зробленай працай і сочаць, каб тая ж адрамантаваная пляцоўка падтрымлівалася ў належным стане. Узнімаецца мясцовы патрыятызм у добрым сэнсе гэтага слова.

Па-другое, улады. Мясцовыя жыхары зацікаўленыя ў тым, каб работа была выкананая хутка, якасна і пры гэтым танна, што дазваляе сэканоміць сродкі бюджэту і атрымаць выніковы прадукт высокага ўзроўню. Акрамя таго, змены будуць спрыяць прытоку свежых і цікавых ідэй.

Як павінен праходзіць адбор праектаў, якія змогуць быць рэалізаванымі? Тут усё вельмі проста: трэба правесці конкурс, на якім будуць адабраныя найлепшыя варыянты.

Хто зможа ўдзельнічаць у такім конкурсе? Не толькі зарэгістраваныя арганізацыі, але і ініцыятыўныя групы ці суполкі і нават асобныя грамадзяне. У тым ліку ёсць прапанова задзейнічаць старастаў, якіх у Беларусі 18 тысяч, але пад іх працу не закладзены асобныя бюджэты.

У якасці прыкладаў ініцыятыў, якія могуць быць падтрыманыя за кошт сродкаў бюджэтаў грамадзянскага ўдзелу, можна назваць арганізацыю работы мясцовага клуба, упарадкаванне дзіцячай пляцоўкі, тэрыторыі вакол вадаёма, з'яўленне парку.

Дзе яшчэ выкарыстоўваюцца бюджэты грамадзянскага ўдзелу? Упершыню такі бюджэт быў прыменены ў Порту-Алегры ў Бразіліі, за апошнія 15 гадоў да ініцыятыў далучыліся больш за 15 000 гарадоў па ўсім свеце. Сярод суседзяў, у якіх гэта ўсё эфектыўна працуе, можна назваць Польшчу. Там гэта не абавязак, але права, якім карыстаюцца амаль паўсюдна.

Гэтую ідэю ў Беларусі падтрымлівае шэраг незалежных экспертаў. Напрыклад, Міраслаў Кобаса з фонда Сапегі, які ўзначаліў групу па распрацоўцы змен, а таксама Уладзімір Кавалкін з Bipart. Кавалкін называе бюджэты грамадзянскага ўдзелу інструментам падвышэння даверу паміж грамадзянамі і дзяржавай, які дазваляе хутка даведацца, якія праблемы хвалююць мясцовыя супольнасці і якія праекты варта падтрымаць. Бо часта, і гэта праўда, чыноўнікі за працай не бачаць праблем звычайных людзей.

Якім чынам плануецца прасоўваць ініцыятыву па змене заканадаўства? На сёння ідзе распрацоўка паправак, акрамя таго, плануецца правесці перагаворы па ініцыятыве ў Міністэрстве фінансаў. Работа будзе завершаная да канца лета, далей пры маёй падтрымцы змены ў заканадаўства будуць прадстаўленыя ў Палаце прадстаўнікоў.

***Ганна КАНАПАЦКАЯ,***
**дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.**

## НА ЧЫГУНЦЫ

**Станцыя «Драгічын» стала лідарам у Брэсцкім аддзяленні Беларускай чыгункі па выніках працы за паўгоддзе. Карэспандэнт «Драгічынскага весніка» запытаў начальніка станцыі Паўла Савіцкага, як атрымалася дасягнуць такога ўзроўню.**

Асноўным «лакаматывам» росту стала павелічэнне аб'ёмаў пагрузкі і выгрузкі на 5 %. «Мы жыва цікавімся планамі і дарожнікаў, і будаўнікоў, радуемся, калі даведваемся аб рамонце ці будаўніцтве дарог, жылых дамоў, іншых буйных аб'ектаў. Значыць, і чыгуначная станцыя будзе забяспечана працай! Па чыгунцы дастаўляецца цукар на прадпрыемства «Экзон», шыфер, цэмент і іншыя буйнагабарытныя будаўнічыя матэрыялы філіяла «Гасторг» раённага спажывецкага таварыства. Мы з задавальненнем супрацоўнічаем з усімі, хто да нас звяртаецца», — каментуе Павел Савіцкі.

## НА ЖАЛЕЗНЫМ КАНІ

**Упершыню ў Ваўкавыску прайшлі міжнародныя спаборніцтвы па мотакросе «Масес cup». Па драйв і энергію на пляцоўку адправіўся карэспандэнт раённай газеты «Наш час».**



volkovysknews.by

За першае месца змагаліся спартсмены з Беларусі, Расіі і Украіны. Да апошняга моманту незразумелы быў лёс гэтых спаборніцтваў: пройдуць яны ці не. І ўсяго за некалькі дзён была падрыхтавана траса мотакросу, у чым вялікая заслуга ў першую чаргу кіраўніцтва і навучэнцаў Ваўкавыскай школы ДТСААФ, а таксама работнікаў камунальнай гаспадаркі. Старшыня Беларускай федэрацыі матацыклетнага спорту Аляксандр Драгун адзначыў высокую арганізацыю спартыўных мерапрыемстваў, падзякаваў райвыканкаму за падтрымку і дапамогу ў іх правядзенні і паабяцаў у наступным сезоне правесці яшчэ адно еўрапейскае першынство ў Ваўкавыску. Спаборніцтвы дзяліліся па пяці класах матацыклаў. Ва ўсіх відах перамаглі беларусы, прычым у трох — ваўкавычане.

## ПЯШЧОТНЫ БІЗНЕС

**Калі сястра Веры Бурлаковай збіралася купляць рэчы для свайго будучага немаўляці, яна перагледзела немагчыма вялікую колькасць сайтаў з такімі ж немагчыма высокімі коштамі. І тут Вера зразумела, што магла б рабіць такія ж прыгожыя рэчы танней і радаваць будучых матуль. Так у яе з'явіўся свой бізнес, пра які расказвае газета «Пухавіцкія навіны».**

Усе эксперыментальныя мадэлі разышліся па знаёмых і сябрах у якасці падарункаў. Калі набіла руку, Вера зарэгістравалася ў якасці рамесніка. Папоўніла свой «машынны парк» сучаснымі швейнымі машынкамі. Зараз у асартыменце пледы, падушачкі і цацкі. Выбірала такі занятак для сябе ў тым ліку для таго, каб працаваць і ўдзяляць шмат часу сям'і. Дарэчы, у яе двое дзетак. Шыць і вышываць вучылася ў дзяцінстве з матуляй і бабуляй, таксама дапамаглі і школьныя ўрокі працы. Лічыць, што гэта карысныя навыкі. Вось яны і спатрэбіліся.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# Каб летнік прынёс радасць

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Такі адпачынак у маляўнічай зоне вельмі карысны для дзяцей, лічыць старшыня абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Анатоль Нікіцін. На яго думку, такіх летнікаў можа быць больш, але не ўсе яны працуюць. У іх ліку ведамасны летнік «Арляня», які належаў УУС. Зараз аб'ект на 100 месцаў пустуе, хоць і знаходзіцца непадалёк ад «Сузор'я». Анатоль Нікіцін прапанаваў аднавіць летнік агульнымі намаганнямі, каб прадпрыемствы і сельскія гаспадаркі адрамантавалі па доміку.

### АБ'ЁМЫ РАСТУЦЬ

У вобласці назіраецца вялікі попыт менавіта на стацыянарныя летнікі, але месцаў не хапае, хоць яны і працуюць у чатыры змены. Таму ў Гродзенскай вобласці два гады таму распачалі праект па выкарыстанні пад круглагадовыя летнікі ўстаноў адукацыі. Базу падбіралі ў экалагічна чыстых месцах, дзе населеныя пункты маюць маляўнічыя краявіды. Такім чынам за два сезоны колькасць аздараўленчых баз вырасла з 35 да 65. Адпаведна, і дзетак у іх адпачыла значна больш. Па словах **першага намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама Галіны КУРГАНСКАЙ,** у рэзерве яшчэ 15 такіх школ, усе яны знаходзяцца каля лясоў і азёраў.

— Аб'ёмы аздараўлення растуць, — падкрэсліла яна. — Сёлета мы аздаравім 60 тысяч дзяцей ад 6 да 16 гадоў. Гэта на 12 % больш, чым летась. Усе летнікі працуюць на поўную магутнасць. Налета плануем аздаравіць 70 тысяч дзетак. Рэзерв ёсць. Будзем прапанаваць гродзенцам ехаць на аздараўленне ў іншыя раёны, а не ствараць ажыятаж у прыгарадных летніках.

### ЗМЕНА З РОБАТАМІ, ПАГРАНІЧНЫ АТРАД І ЮНЫЯ ЛЯСНІЧЫЯ

Насамрэч у школьнікаў вобласці ёсць нямала альтэрнатыў у выбары летняга адпачынку. Многія аддаюць перавагу профільнаму кірунку.

Напрыклад, у Лойкаўскай сярэдняй школе працуе палатачны перасовачны летнік «Следапыт». Сёлета яго ўдзельнікі за дзевяць дзён прайшлі амаль 80 кіламетраў. Са сваіх паходаў яны прынеслі экспанаты ў школьны музей.

Гродзенскі раён — прыгранічны. Школьнікі ахвотна едуць у летнікі, якія працуюць на памежных заставах. Іх створана 19. Як расказаў **дырэктар патрыятычнага летніка Рацічкай СШ Максім ЦЯЦЕРСКІ,** перш-наперш сюды бяруць праблемных дзяцей і дзяцей з малазабяспечаных сем'яў. Палаткі ставяцца на самой тэрыторыі заставы, дзеці вучацца разбіраць і збіраць зброю, авалодваюць навыкамі следапытаў. Для многіх гэта першы крок у будучую прафесію.

У Скідзелі прышкольны летнік аб'яднаў 60 аматараў робататэхнікі. Школьнікі сталі пераможцамі першага абласнога конкурсу і прынялі ўдзел у фестывалі ў Мінску. Важна, што летнік з IT-ухілам працуе на бюджэтнай аснове.

У рамках летняй змены арганізаваны атрад юных ляснічых у аграгарадку Індура Гродзенскага раёна. Трапіць у яго не проста, бо мясцовае лясніцтва плаціць школьнікам за пасадкі і розныя іншыя работы. Гэта і заробак, і аздараўленне адначасова.

Профільны летнік «Навука» сабраў школьную інтэлектуальную эліту вобласці ў Парэцкай школе-інтэрнаце. Дарэчы, аб'ект задзейнічаны на ўвесь сезон.

Профільныя летнікі становяцца ўсё больш прывабнымі, бо дзяцей аб'ядноўваюць агульныя інтарэсы і цікавыя справы. Гэта перспектыўны напрамак, і ён будзе развівацца, запэўнілі спецыялісты адукацыі.

### ПАЛЕПШЫЦЬ АБСТАЛЯВАННЕ І АДКРЫЦЬ БАСЕЙН

У ліку «болевых» пунктаў дэпутаты адзначылі некалькі момантаў.



Дэпутат гарадскога Савета, галоўны ўрач 1-й дзіцячай паліклінікі Гродна Ірына Луканская звярнула ўвагу на аздараўленне дзяцей, якія маюць хранічную паталогію. Яна прапанавала ўвесці санаторныя змены ў спецыялізаваных школах-інтэрнатах. Напрыклад, у Азёрскай санаторнай школе-інтэрнаце можна прымаць дзетак са скаліёзам. У школе пяць гадоў не працуе басейн, а вада вельмі спрыяльна дзейнічае на мышцы. Была агучана прапанова яго адрамантаваць. Ужо некалькі гадоў аб'ект не трапляе ў абласную інвестпраграму, магчыма, дэпутатам удасца ўключыць яго ў спіс. Ёсць патрэба і ў медыцынскім пераабсталяванні спецыялізаваных школьных устаноў.

**Старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар ЖУК** звярнуў увагу на ўдасканаленне дзіцячага адпачынку.

— Сёлета на падрыхтоўку аздараўленчага сезона ў вобласці затрачана больш за мільён рублёў. Працуе каля тысячы летнікаў розных тыпаў. Мы цалкам ахапілі дзяцей-сірот, але ёсць катэгорыя, якая патрабуе большай увагі, — гэта дзеці-інваліды. З іх праходзіць аздараўленне толькі 24 %. У «Сузор'і» будзе аздароўлена 15 чалавек. Трэба ўдасканальваць гэты кірунак. Дэпутаты павінны садзейнічаць развіццю сістэмы аздараўлення, прадугледжваць на гэта сродкі пры размеркаванні бюджэту ў раёнах, — падкрэсліў ён.

Члены абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў выйшлі з ініцыятывай забеспячэння бясплатнага праезду школьнікам, якія ў летні час наведваюць прышкольныя летнікі. Такое пажаданне выказалі многія бацькі. На сённяшні дзень бясплатны праезд дзейнічае па 30 чэрвеня. У некаторых рэгіёнах, у тым ліку ў сталіцы, такія льготы для школьнікаў ужо дзейнічаюць.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 9 жніўня 2018 года.**